*Родная газета на роднай мове*

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

**19** ВЕРАСНЯ 2008 г. ПЯТНІЦА № 177 (26290)

Кошт 500 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.



## ЗАСТАВАЙЦЕСЯ СА «ЗВЯЗДОЙ»!

*Ідзе падпіска на IV квартал 2008 года*

**Падпісныя цэны на газету «Звязда» (у рублях)**

| *Індэкс* | *на 1 месяц* | *на 3 месяцы* |
|---|---|---|
| 63850 (індывідуальны) | 9200 | 27600 |
| 63145 (індывідуальны льготны для пенсіянераў, ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны) | 8700 | 26100 |
| 63858 (ведамасны) | 14700 | 44100 |
| 63239 (ведамасны льготны для ўстаноў міністэрстваў культуры, адукацыі і аховы здароўя) | 13400 | 40200 |


## Беларусь заўсёды імкнулася наладжваць добрыя адносіны з Еўропай

**Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ў час інтэрв'ю замежным СМІ.**

«З самых першых дзён майго прэзідэнцтва я дакладна вызначыў знешнепалітычную стратэгію краіны, зыходзячы з таго, што яна павінна быць шматвектарнай», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

«Наша знешняя палітыка не можа быць іншай — гэта прадыктавана самім геаграфічным становішчам краіны, — заявіў Аляксандр Лукашэнка. — Бо, як вядома, мы не толькі неад'емная частка Еўропы, але і яе геаграфічны цэнтр». Прэзідэнт дадаў, што яшчэ адзін фактар імкнення да трывалых і сяброўскіх адносінаў з заходнееўрапейскімі краінамі — менталітэт Беларусі. «Наш народ дружалюбны, неагрэсіўны, працавіты, ён прывык жыць сваёй працай і сваім розумам. Таму беларусы ніколі не хацелі ніякага абвастрэння з нашымі суседзямі», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка таксама дадаў, што эканоміка падштурхоўвае Беларусь да таго, каб праводзіць адкрытую шматвектарную палітыку.

Беларусь поўнасцю адкрыта для міжнародных наглядальнікаў. Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Беларусі.

«Калі вы гаворыце, што для вас настолькі важныя парламенцкія выбары, то мы поўнасцю адкрылі для вас краіну: ідзіце, глядзіце, назірайце, ці ў адпаведнасці з нашымі законамі праходзяць перадвыбарны перыяд, датэрміновае галасаванне і самі выбары», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што, хоча гэтага Захад ці не, новы парламент будзе выбраны, і пытанне аб тым, які ён будзе, вырашыць беларускі народ. «Галоўная мая задача і роля ў гэтых выбарах не ўзначаліць якую-небудзь партыю, а зрабіць так, каб менавіта народ вызначыў твар гэтага парламента», — заявіў Прэзідэнт. «Мы хочам, каб вы нас успрынялі і прызналі нашы выбары», — дадаў ён.

Прэзідэнт Беларусі заявіў, што кіраўніцтва Беларусі не хоча мець стасункі з Захадам праз тую жалезную заслону, якую ён выбудаваў на граніцы з Беларуссю. «Мы хочам мець зносіны з вамі ва ўсіх сферах: ад навукі да самых складаных пытанняў узаемаадносінаў паміж дзяржавамі», — рэзюмаваў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы даў інтэрв'ю журналістам брытанскай газеты «Файнэншл Таймс» і нямецкай газеты «Франкфуртэр Альгемайне Цайтунг».

**Паводле паведамленняў прэс-службы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і БЕЛТА.**

# ОРША. НАПЯРЭДАДНІ...




Фота БЕЛТА.

## Нязначна пацяплее толькі на наступным тыдні

**У бліжэйшыя выхадныя характар надвор'я амаль не зменіцца: тэрыторыя Беларусі будзе знаходзіцца пад уплывам Чарнаморскага цыклона, паведаміў рэдакцыі начальнік службы гідраметэапрагнозаў Рэспубліканскага гідрамет-цэнтра Дзмітрый Рабаў.**

Таму ў пятніцу і суботу будзе даволі дажджліва. Тэмпература паветра ўначы 4—10, удзень 8—14 градусаў. У нядзелю ўначы ападкі будуць назірацца паўсюдна, а вось удзень — толькі месцамі. Тэмпература паветра ўначы 5—11, удзень — 10—16 цяпла.

У першыя два дні наступнага тыдня ўзмоцніцца ўплыў скандынаўскага антыцыклона, які адцісне зону дажджоў у паўднёвыя раёны Беларусі, дзе і будуць назірацца ападкі. Тэмпература паветра ўначы 5—10, удзень 10—17 цяпла. Згодна з доўгатэрміновымі прагнозамі, істотнага паляпшэння надвор'я на наступным тыдні пакуль не прадбачыцца.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Фелікс ЧАРНЯЎСКІ: *На слыху*

## «НЕ БАЧУ ПАДСТАЎ, КАБ БЕЛАРУСКІЯ БАНКІ ЗАЛІХАМАНІЛА...»

**Як наша газета ўжо паведамляла, у сераду пасля зніжэння біржавых паказчыкаў у Расіі таргі акцыямі на біржах ММВБ і РТС былі прыпыненыя. Учора ж было аб'яўлена, што таргі адновяцца толькі ў пятніцу: тайм-аўт быў прадастаўлены інвестарам з мэтай усё ўзважыць, каб прыняць далейшае рашэнне...**

Паводле слоў расійскага міністра фінансаў Аляксея Кудрына, біржы ўчора займаліся зверкай разлікаў і ўзаемнай запазычанасці паміж удзельнікамі фондавага рынку. Аднак ёсць і іншыя версіі гэтаму вымушанаму «прастою». У прыватнасці, некаторыя эксперты адной з прычын, па якой Федэральная служба па фінансавых рынках не рашылася адкрываць таргі, называюць сітуацыю на сусветных біржах: маўляў, пры аднаўленні таргоў інвестары маглі звярнуць увагу на амерыканскі Dow Jones і не ўбачылі б там нічога добрага. А таму падзенне працягвалася б. Між тым, расійскі прэзідэнт Дзмітрый Мядзведзеў прапанаваў выдзеліць паўтрыльёна рублёў на падтрымку расійскага фондавага рынку, пры гэтым 250 мільярдаў могуць быць выдзеленыя з бюджэту. Акрамя таго, як мы раней узгадвалі, буйнейшым дзяржбанкам былі выдзеленыя істотныя сродкі для падтрымання ліквіднасці: падзенне расійскага фондавага рынку ў многім звязваюць з крызісам ліквіднасці банкаўскай сістэмы.

Што датычыцца апошніх навін з далёкага замежжа, то інфармацыйныя агенцтвы паведамляюць аб намеры цэнтрабанкаў некалькіх краін свету аб'яднаць намаганні па супрацьстаянні глабальнаму фінансаваму крызісу. У прыватнасці, «падпісаліся» на гэта Банк Канады, Банк Англіі, Цэнтрабанк Еўропы, Федэральная рэзервовая сістэма ЗША, Банк Японіі і Швейцарскі нацыянальны банк, а размова, між іншым, ідзе, напрыклад, аб заключэнні пагаднення на абмен некаторага аб'ёму валюты на пэўную дату.

Сітуацыя ж у нашай краіне ў сувязі з сусветнымі хваляваннямі ў спецыялістаў занепакоенасці не выклікае.

— Нашу банкаўскую сістэму апошнія падзеі не павінны закрануць, — выказаў сваё меркаванне ў гутарцы з карэспандэнтам «Звязды» старшыня Асацыяцыі беларускіх банкаў Фелікс Чарняўскі. — Адзінае, — магчыма, якісьці з банкаў працуе на расійскім рынку каштоўных папер, але я думаю, што там прадпрынятыя сур'ёзныя меры наконт ліквіднасці рынку каштоўных папер, і апошні павінен стабілізавацца.

Заўважу і тое, што ў нас замежнага капіталу ў пасівах банкаў няшмат, прычым гэта доўгатэрміновыя крэдыты і яны не будуць адклікацца. Што ж датычыцца акцыянернага капіталу замежных банкаў, якія да нас прыйшлі, то скідваць акцыі ў іх няма прычын, — наадварот, гэтыя фінансавыя ўстановы імкнуцца патрапіць да нас. Таму падстаў для таго, каб беларускія банкі заліхаманіла і тут узніклі нейкія праблемы, няма. Як няма прычын хвалявацца і ў грамадзян. Калі паглядзець на курсы валют, то сёння курс расійскага рубля ў нас крыху ўзрос, долара — знізіўся на два рублі, еўра — павысіўся. Мы бачым, што нічога незвычайнага не адбываецца, нацыянальная валюта адчувае сябе стабільна.

**Ігар ШЧУЧЭНКА.**

## Сялянскія саламяныя лялькі праводзяць на «Дажынкі»

**Работнікі культуры Славенскага сельсавета ў Шклоўскім раёне прыдумалі, як узняць настрой удзельнікам рэспубліканскага фестывалю-кірмаша «Дажынкі-2008», які напрыканцы гэтага тыдня пройдзе ў Оршы.**



На дарозе, якая вядзе ад Магілёва да Оршы, каля вёсак усталяваны вялізныя лялькі. Яны зробленыя з рулонаў саломы новага ўраджаю і ўпрыгожаны яркай тканінай ды рознакаляровымі стужкамі — проста і прыгожа.

На перакрыжаванні паміж Княжыцамі і Чамаданамі стаіць пара сталых гаспадароў. А каля Любінічаў на пастаменце — маладая сялянка. Яе прыбіраюць да «Дажынак» дырэктар Славенскага дома культуры Уладзімір Сяргеенка і акампаніятар Любініцкага сельскага клуба Вікторыя Зязюліна.

— Наша маладая жанчына — у вяночку з палявых кветак і ў вясёленькім сарафане, — расказвае Вікторыя, пакуль трымае лесвіцу, на якой балансуе Уладзімір і спрабуе прыладзіць да вянка стужкі.

— Яна сімвалізуе дзяўчыну, якая пасля працы прыбралася і вырашыла патанчыць. Напрыклад, на свяце «Дажынкі»!

— Трэба ствараць святочны настрой людзям, — кажа Уладзімір Сяргеенка. — Вяскоўцы добра папрацавалі, сабралі добры ўраджай, а цяпер надышоў час павесяліцца, атрымаць задавальненне ад жыцця. Працаўнікі сельскай гаспадаркі гэта заслужылі.

Падчас размовы з работнікамі культуры аўтамабілі, якія едуць па шашы, сігналяць.

— А многія яшчэ і спыняюцца, фатаграфуюцца, — падхоплівае Уладзімір. — Ды няхай людзі проста ўсміхнуцца нашым прыгожым лялькам і паедуць далей са святочным настроем!

**Ілона ІВАНОВА.**

*Шклоўскі раён.*

*Падрабязнасці*

## На магнітным праязным — «дадатковы» дзень

**Пасля вяртання ў сталіцу студэнтаў, школьнікаў, з заканчэннем сезона летніх водпускаў многія, напэўна, звярнулі ўвагу, якія чэргі ўтварыліся на пачатку месяца ў касы метрапалітэна.**

З гэтай нагоды работнікі сталічнай падземкі вырашылі нагадаць пасажырам: тэрмін дзеяння праязнога за бягучы месяц распаўсюджваецца і на першы дзень наступнага.

— Такое палажэнне дзейнічае даўно, яно было ўведзена яшчэ з укараненнем самой магнітнай карткі. Магчыма, проста не ўсе пра гэта ведалі, — сказаў начальнік службы руху Мінскага метрапалітэна Рыгор Якімкоў.

Варта ўдакладніць, што такі бонус у выглядзе дадатковага дня распаўсюджваецца толькі на месячныя праязныя і толькі на набытыя для праезду ў самім метро. На сумешчаных з іншымі відамі грамадскага транспарту праязных білетах такой «ільготы» няма. Гэтак жа як і на нядаўна ўведзеных бескантактных месячных праязных на метро.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## «ЗВЯЗДА» — НАЙЛЕПШАЯ ГАЗЕТА! ЦЯПЕР УСІМ СКАЖУ ПРА ГЭТА!»

*Рэпартаж з колаў...*

**Як лёгка вярнуцца ў мінулае — варта... пераблытаць касеты, націснуць на дыктафоне кнопачку «пуск» і...**

**І адразу «ўбачыш» запоўненую залу Клічаўскага райвыканкама, пачуеш галасы чытачоў-падпісчыкаў, успомніш твары людзей — рознага веку: сталага (скажам так), сярэдняга (іх там найболей было), зусім маладыя. Прынамсі, адна з дзяўчат свае ўражанні ад сустрэчы сфармулявала так: «Звязда — найлепшая газета! Цяпер усім скажу пра гэта».**

**Тады, як цяпер помнім, яна цвёрда рашыла падпісацца. І напэўна ж не перадумала! А вось ці спадабалася ёй газета, ці апраўдала надзеі, ці прыжылася?..**

**Не трэба, мусіць, казаць, што мы прыедзем у Клічаў яшчэ (і, магчыма, не раз); дасць бог, сустрэнемся і распытаем. Пакуль жа — маршрут быў трохі інакшы. Да таго ж... інакшым быў позірк. Чаму? Пра гэта трошкі пазней, цяпер...**

***(Заканчэнне на 2-й стар.)***




**Найбуйнейшы звяздоўскі прыз — халадзільнік «Атлант» Людміле БОНДАР уручыў па просьбе газеты начальнік Рэчыцкага РВПС Вячаслаў ПАПОЎ.**

## Адкуль камп'ютары?

Супрацоўнікі аддзела ДАІ Дубровенскага РАУС на аўтадарозе Дуброўна — Баева спынілі «Опель», у якім, як потым высветлілася, 38-гадовы беспрацоўны перавозіў камп'ютарную тэхніку коштам амаль 43 млн рублёў. Паколькі дакументы на камп'ютары адсутнічалі, іх канфіскавалі, да высвятлення абставінаў.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**


## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ 04 ноября 2008 года

Минский городской центр недвижимости

**Открытое акционерное общество «МАПИД» (Продавец) совместно с УП «Минский городской центр недвижимости» (Организатор аукциона) проводят открытый аукцион по продаже квартир без отделки в доме № 26 по ул. Бельского в г. Минске (6 подъезд)**

| № лота | Наименование объекта: № квартиры | количество комнат | этаж | подъезд | Площадь, кв.м: общая | жилая | Начальная цена, руб. | Размер задатка, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 167 | 3 | 1 | 6 | 88,7 | 48,1 | 178 300 000 | 17 830 000 |
| 2 | 168 | 1 | 1 | 6 | 50,1 | 21,7 | 100 800 000 | 10 080 000 |
| 3 | 169 | 4 | 1 | 6 | 115,6 | 73,6 | 232 400 000 | 23 420 000 |
| 4 | 170 | 3 | 2 | 6 | 88,8 | 47,9 | 178 500 000 | 17 850 000 |
| 5 | 171 | 1 | 2 | 6 | 49,8 | 21,7 | 100 100 000 | 10 010 000 |
| 6 | 172 | 1 | 2 | 6 | 50,1 | 21,7 | 100 800 000 | 10 080 000 |
| 7 | 173 | 3 | 2 | 6 | 89,2 | 48,3 | 179 300 000 | 17 930 000 |
| 8 | 174 | 3 | 3 | 6 | 89,4 | 48,4 | 179 700 000 | 17 970 000 |
| 9 | 175 | 1 | 3 | 6 | 49,9 | 21,6 | 100 300 000 | 10 030 000 |
| 10 | 176 | 1 | 3 | 6 | 50,0 | 21,8 | 100 500 000 | 10 050 000 |
| 11 | 177 | 3 | 3 | 6 | 89,0 | 48,2 | 178 900 000 | 17 890 000 |
| 12 | 178 | 3 | 4 | 6 | 89,3 | 48,4 | 179 500 000 | 17 950 000 |
| 13 | 179 | 1 | 4 | 6 | 49,9 | 21,7 | 100 300 000 | 10 030 000 |
| 14 | 180 | 1 | 4 | 6 | 50,0 | 21,8 | 100 500 000 | 10 050 000 |
| 15 | 181 | 3 | 4 | 6 | 89,4 | 48,4 | 179 700 000 | 17 970 000 |
| 16 | 182 | 3 | 5 | 6 | 88,9 | 47,9 | 178 700 000 | 17 870 000 |
| 17 | 183 | 1 | 5 | 6 | 50,1 | 21,8 | 100 800 000 | 10 080 000 |
| 18 | 184 | 1 | 5 | 6 | 50,1 | 21,8 | 100 800 000 | 10 080 000 |
| 19 | 185 | 3 | 5 | 6 | 89,3 | 48,2 | 179 500 000 | 17 950 000 |
| 20 | 186 | 3 | 6 | 6 | 89,2 | 48,3 | 179 300 000 | 17 930 000 |
| 21 | 187 | 1 | 6 | 6 | 49,9 | 21,7 | 100 300 000 | 10 030 000 |
| 22 | 189 | 3 | 6 | 6 | 89,2 | 48,2 | 179 300 000 | 17 930 000 |

1) Аукцион состоится 04 ноября 2008 г. в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Октябрьская, 5 (КЗ «Минск», 3-й этаж, малый зал, ауд.310, регистрация участников — в 10.00.

2) К участию в аукционе допускаются физические лица — граждане Республики Беларусь.

3) Для участия в аукционе необходимо представить следующие документы в УП «Минский городской центр недвижимости»: заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с объектом; соглашение о правах и обязанностях сторон; ксерокопию паспорта; заверенные банком копии платежных поручений подтверждающих внесение: а) задатка в сумме 10 % начальной цены; б) платы за регистрацию в размере $^{1}/_{4}$ минимальной заработной платы.

Оплата осуществляется по безналичному расчету в белорусских рублях на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012024570010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской области, код 153001331, УНП 190398583.

Квартиры продаются только для использования под жилье. Граждане, выигравшие торги, обязаны вступить в товарищество собственников. Договор купли-продажи квартир с гражданами должен быть нотариально удостоверен и зарегистрирован в Республиканском унитарном предприятии «Минское городское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру». Расходы, связанные с совершением нотариальных действий и государственной регистрацией договора купли-продажи и основанного на нем перехода права собственности оплачиваются победителем аукциона.

Задаток возвращается всем участникам аукциона, кроме участников аукциона, выигравших торги, в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона или с момента регистрации организатором аукциона отказа от участия в аукционе **по письменному заявлению** участника аукциона на лицевой его счет с указанием полных банковских реквизитов для возврата денежных средств (задатка).

Участнику аукциона, выигравшему торги, задаток не возвращается, а учитывается при окончательных расчетах.

При подаче документов на участие в аукционе физическое лицо предъявляет паспорт, его представитель — паспорт и доверенность, удостоверенную нотариально.

Все участники аукциона перед подачей заявления на участие в торгах должны детально ознакомиться с утвержденными Условиями проведения аукциона и объектом.

Оплата стоимости приобретенных на аукционе квартир осуществляется в установленном для физических лиц порядке по безналичному расчету в белорусских рублях в течение 25 календарных дней со дня подписания протокола о результатах аукциона на расчетный счет продавца. Договор купли-продажи квартир подписывается в течение 14 календарных дней со дня истечения срока, отведенного для оплаты, при условии внесения победителем полной оплаты за квартиру и оплаты за подготовку и проведение торгов организатору аукциона УП «Минский городской центр недвижимости».

Победитель аукциона помимо оплаты за объект обязан в сроки, указанные в протоколе о его результатах, произвести оплату услуг организатору аукциона сверх цены продажи в размере 1 % от окончательной стоимости квартиры.

Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются с 20 октября 2008 г. по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6 в понедельник – четверг с 8.45 до 18.00, в пятницу с 8.45 до 16.45 по 03 ноября 2008 г. до 17.00 включительно. (Перерыв на обед: с 13.00 до 14.00). Телефон для справок: 227 40 22. Интернет: www.mgcn.by. Осмотр квартир проводится с 20 октября 2008 г. по вторникам и четвергам в присутствии сотрудников МАПИД с 14.00 до 16.00 по адресу: ул. Бельского, 26. Телефоны для справок: 207 19 15; 208 58 12.

УНП 190398583



ОДО «СЕРВИС-ТЕХНИКА» (ПРОДАВЕЦ) СОВМЕСТНО С УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ» (ОРГАНИЗАТОР АУКЦИОНА)

## ПРОВОДЯТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

**по продаже изолированного нежилого помещения (производственное помещение) с инвентарным номером 500/D-703381 общей площадью 194,1 кв. м, расположенного на ул. Лукьяновича, 10 в г. Минске.**

Начальная цена — 360 000 000 белорусских рублей.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, условиями проведения аукциона; нотариально заверенные копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации; соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенные банком копии платежных поручений, подтверждающих внесение задатка и платы за участие в аукционе в размере 4 базовых величин; а также иные документы в соответствии с условиями проведения аукциона.

Задаток в размере 36 000 000 белорусских рублей и плата за участие в аукционе перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012024570010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской области, г. Минск, код 153001331, УНП 190398583.

Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемый объект. Порядок проведения торгов указан в условиях проведения аукциона.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем аукциона подписывается в течение 10 календарных дней с даты проведения аукциона. Оплата объекта осуществляется в течение 30 календарных дней с даты проведения аукциона. Аукцион состоится **20 октября 2008 года в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Заявление на участие в аукционе и необходимые документы принимаются **по 17 октября 2008 года до 16.45** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефон для справок: 227 48 36 — УП «Минский городской центр недвижимости».**



Минский городской центр недвижимости

## ПРИГЛАШАЕТ К УЧАСТИЮ В АУКЦИОНЕ

по продаже незавершенных строительством объектов коммунальной собственности:

- магазина промышленных товаров общей площадью 1203,6 кв.м в жилом доме № 2 по генплану в микрорайоне Дружба-3 (1-я очередь строительства);

- магазина продовольственных товаров общей площадью 735,3 кв.м в многоквартирном крупнопанельном жилом доме по генплану № 18 в застройке микрорайона «Сухарево-4» (2-я очередь строительства).

Аукцион состоится **24.09.2008.**

**Телефон для справок: (017)227 40 22 (сайт: www.mgcn.by).**

УНП 190398583



ISSN 1990 - 763X


*Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 19.09.2008 г. (для б/н разлікаў)*

| | |
|---|---|
| 1 долар ЗША | 2 113,00 |
| 1 еўра | 3 028,14 |
| 1 латвійскі лат | 4 287,74 |
| 1 літоўскі літ | 877,05 |
| 1 чэшская крона | 125,68 |
| 1 польскі злоты | 902,53 |
| 1 расійскі рубель | 83,09 |
| 1 украінская грыўня | 419,87 |

*Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў*

**Цэнтрабанк РФ**

| | |
|---|---|
| USD | 25,4307 |
| 10 UAH | 51,5313 |
| 1000 BYR | 12,0411 |
| EUR | 36,4066 |

*Курс у гандлёвых кампаніях (на 18.09.2008 г.)*

| | |
|---|---|
| USD | 2135 / 2210 |

Агенцтва Уладзіміра Граўцова


*Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2008 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.*

*ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009*

Заснавальнікі — установа «Рэдакцыя газеты «Звязда» і грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі». Рэгістрацыйны № 12.

# ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

19 ВЕРАСНЯ 2008 г. ПЯТНІЦА № 38 (15541)

# «МАЛАДЗЁЖНАЯ ПЛЯЦОЎКА» НА «ДАЖЫНКАХ»

**Сёння ў Оршы адкрыецца фестываль працаўнікоў вёскі «Дажынкі». Рыхтаваць горад да свята актыўна дапамагалі і тысячы маладых людзей, членаў БРСМ у складзе студэнцкіх і добраахвотніцкіх атрадаў.**

Актывісты абласной арганізацыі маладзёжнага саюза былі занятыя ў асноўным на будаўнічых работах, працавалі на аб'ектах добраўпарадкавання. Актыўныя члены студэнцкіх атрадаў, якія асабліва вызначыліся падчас работ па падрыхтоўцы Оршы да рэспубліканскага свята, будуць узнагароджаныя заахвочвальнымі прызамі на маладзёжнай пляцоўцы «Дажынах», якая традыцыйна будзе разгорнутая на фэсце. Тут жа маладым працаўнікам сельскай гаспадаркі, якія вызначыліся на сёлетнім жніве, будуць уручаны прэміі і нагрудныя знакі «За поспехі ў працы», заснаваныя БРСМ.

А ў дзень адкрыцця святочных мерапрыемстваў у горадзе маладзёжная пляцоўка будзе занята калектывамі мастацкай самадзейнасці Віцебскай вобласці. Выступленні маладых артыстаў пазнаёмяць удзельнікаў і гасцей свята з творчым патэнцыялам віцебскай моладзі і стануць своеасаблівай справаздачай перадавікам сельскагаспадарчай вытворчасці.

Акрамя таго, тут будзе арганізаваная фотавыстава «Моладзь у асобах». Экспазіцыю складуць партрэты членаў найлепшых будатрадаў вобласці, якія праславіліся ў тым ліку і пры падрыхтоўцы свята, а таксама фота маладых спецыялістаў, студэнтаў і працоўнай моладзі.

Абласная арганізацыя БРСМ возьме непасрэдны ўдзел у правядзенні і іншых фэставых мерапрыемстваў — для работ у святочным горадзе будзе прыцягнута 150 валанцёраў.

**Кар. «ЧЗ».**



На здымку — маладая сям'я Пяцігорцаў з СВК «Ціміразеўскае» Капыльскага раёна. Сяргей і Вольга ўжо другі сезон плённа адпрацавалі ў адным экіпажы: у 2007 годзе занялі другое месца на рэспубліканскім фестывалі «Дажынкі», сёлета — рэальныя прэтэндэнты на першае. Нягледзячы на тое, што Вольга яшчэ ў дэкрэтным водпуску (маленькай Ангеліне споўнілася два годзікі), спраўна дапамагае мужу. Праца ў земляроба пачынаецца а шостай гадзіне, а заканчваецца ўжо глыбокай ноччу... «Работа цяжкая, — дзеліцца Вольга, — але тут можна і грошы добрыя зарабіць. Не лёгкі гэта хлеб — збіраць хлеб».

**Марына БЕГУНКОВА.** *Капыльскі раён.*

# ЭНЕРГІЯ ТВАЙГО ЖЫЦЦЯ

**Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі аб'яўляе старт новага маладзёжнага стыль-праекта «Энергія твайго жыцця».**

На працягу некалькіх месяцаў ён пройдзе ва ўсіх абласных цэнтрах краіны. Сёння ў Магілёве з 17 да 22 гадзін Плошча зорак (дзе, дарэчы, ззяе «Зорка БРСМ», устаноўленая летась у гонар 5-годдзя маладзёжнага саюза) будзе размалявана ў самыя яркія колеры энергіі маладосці, стракатай фантазіі і нястрымнай творчасці. Як адзначылі арганізатары, стыль-праект «Энергія твайго жыцця» багаты на мерапрыемствы. Акрамя праграм з удзелам вядомых беларускіх калектываў і выканаўцаў, лепшых дыджэяў краіны, ён аб'яднае самых таленавітых, актыўных, крэатыўных і прагрэсіўных юнакоў і дзяўчат. Сваё майстэрства на спецыяльна арганізаваных пляцоўках пакажуць скейтбардысты, велатрыялісты, графітысты, аматары брэйк-дансу, ролеры і стрыт-артэры. Дарэчы, усё гэта відовішча будзе трансклявацца на поліэкраны ўстаноўленыя каля сцэны. Таму ўбачыць і ацаніць творчасць маладых змогуць усе ахвотныя.

Важным элементам стыль-праекта «Энергія твайго жыцця» стане правядзенне напярэдадні важнай палітычнай падзеі — выбараў дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі — тэматычных маладзёжных акцый і флэш-мобаў.

**Кар. «ЧЗ».**

# ВОБРАЗ МАЦІ Ў РОССЫПЕ КВЕТАК

**Маці дорыць жыццё, гэта самы дарагі чалавек для кожнага. Яна пяшчотная, ласкавая, мудрая, самая добрая і самая прыгожая. Так лічаць усе без выключэння: і дарослыя, і дзеці. Таму Дзень маці — асаблівае свята і да яго неабходна рыхтавацца загадзя.**

Сёлета Вілейскі гарадскі камітэт БРСМ вырашыў правесці не зусім звычайны конкурс віншавальных паштовак «Вобраз маці ў россыпе кветак». У ім могуць узяць удзел усе без выключэння: як калектывы, так і асобныя аўтары ўстаноў адукацыі Вілейскага раёна (прычым гэта могуць быць і настаўнікі, і вучні). Конкурс ужо стартаваў, завершыцца ён 14 кастрычніка — пераможцы будуць вызначаны ў розных намінацыях. А ўзнагароджанне іх адбудзецца на абласным свяце «Цеплыня матчынай душы», дзе будзе арганізавана выстава лепшых работ.

Аднак, напэўна, не ў гэтым галоўнае, а ў тым, што кожны ўдзельнік у сваёй паштоўцы яшчэ раз выкажа любоў да сваёй маці.

**Святлана СУХАРКО.**

# СТУДГАРАДОК ЗАПРАШАЕ...

**Студэнцкі гарадок Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта арганізаваў святочную праграму для першакурснікаў.**

Спачатку для «маладых» была арганізавана своеасаблівая вандроўка па ўніверсітэцкіх інтэрнатах, у кожным з якіх маецца свая «іскрынка» — яе ў іскраметных творчых вобразах прадставілі галоўным героям свята старэйшыя сябры.

Затым былі падведзены вынікі круглагадовай спартакіяды студгарадка. Пераможны трафей у выглядзе кубка на цэлы год «пасяліўся» ў студэнцкім інтэрнаце № 6. Першакурснікаў павіншаваў таксама студэнцкі танцавальны калектыў «Non Stop», які сёлета адзначае сваё дзесяцігоддзе.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# СТАРЭЙШЫ ФАКУЛЬТЭТ У БЕЛАРУСІ

**Эканамічны факультэт Беларускай дзяржаўнай сельскагаспадарчай акадэміі адзначае двайны юбілей. Факультэт быў створаны ў 1928 годзе, але яшчэ 150 гадоў таму ў Горы-Горацкай земляробчай школе, дзе рыхтавалі кіраўнікоў буйных маёнткаў, упершыню ў Расіі была адкрыта спецыяльнасць «Эканоміка».**

Сёння на эканамічным факультэце вучыцца больш за паўтысячы студэнтаў, якія будуць працаваць эканамістамі ў сельскай гаспадарцы.

Факультэт ганарыцца сваімі выпускнікамі, якія сталі вядомымі палітыкамі, гаспадарнікамі, навукоўцамі. У іх ліку — Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка.

Юбілей эканамічнага факультэта ў акадэміі адзначаюць навукова-практычнай канферэнцыяй.

**Ілона ІВАНОВА.**

# «РЫТМ» ПАПРАЦАВАЎ НА СЛАВУ

**Будучыя мастакі па тканінах, механікі і канструктары, (усяго 19 студэнтаў Віцебскага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта) у вёсцы Курына Віцебскага раёна разам з прафесійнымі будаўнікамі працавалі мінулым летам на будаўніцтве новых вытворчых плошчаў віцебскай бройлернай птушкафабрыкі. Усяго тут адначасова будуць размешчаны 64 тысячы дарослых птушак.**



— Наш атрад меў назву «Рытм-1», — расказвае камандзір атрада Кірыл Сіліванаў. Ён вучыцца на 3-м курсе на менеджара-эканаміста. Летась таксама працаваў у будаўнічым атрадзе бетоншчыкам — у пасёлку Лужасна, што недалёка ад абласнога цэнтра. — Мы на будаўніцтве ў Курыне займаліся бетоннымі работамі. Працавалі асобна ад іншых. За намі былі замацаваны два майстры. Яны таксама маладыя. Калі што, заўсёды падказвалі. Пачалі працаваць напрыканцы ліпеня. Працавалі і па суботах, бо за выхадны дзень плацяць у двайным памеры. Ежу бралі з сабой. Безумоўна, можна было заказаць з дастаўкай — але хацелася зэканоміць. Колькі грошай зарабілі? Нам адразу сказалі — будзеце старацца, не пакрыўдзім грашыма...

А чаму сярод вас дзяўчат не было? Чаму менавіта на будоўлю папрасіліся? — запытаў я камандзіра і ягоных таварышаў.

— Якія ж з дзяўчат бетоншчыцы? А будоўля? Выбару асаблівага, калі шчыра, і не было. Прапанавалі — пагадзіліся. Праўда, можна было паехаць на будаўніцтва ў далёкі Ямал — у Расію. Ды, аказваецца, ёсць нюансы ў выплаце падаткаў з заробку. Як мне расказалі мае суразмоўцы, там бяруць з нашых студэнтаў, як з іншаземцаў (гэта пра нас братоў — беларусаў?) 30 працэнтаў падаткаў плюс яшчэ непасрэдны падатак з сумы. А ў нас байцы студэнцкіх будаўнічых атрадаў наогул вызвалены ад падаткаў. І такое рашэнне прымалася на самым версе ўлады.

Працавалі студэнты ў калектыве будаўнічага ўпраўлення 38 (трэст № 9).

— Добра працавалі. Вось да іх — праблемы былі, — кажа малады прараб упраўлення Міхаіл Маняк. — Гэтыя асобна ад астатніх яны ў нас працавалі (усяго тут прыкладна 200 будаўнікоў). Так лягчэй было падлічыць аб'ёмы выкананага... Зарабілі нядрэнна — у сярэднім больш за 900 тысяч рублёў. Але былі і такія, якім было налічана па 300 тысяч. Лянота, парушэнне дысцыпліны — вось і вынік.

Прараб расказаў, што асаблівасць гэтага аб'екта, дзе працаваў будаўнічы атрад, у дрэнным грунце. Раней на гэтым месцы было балота. Меліяратары потым асушылі плошчу — усяго 8,5 гектара, але гразі тут заўсёды шмат. Дарэчы, калі мы гутарылі, ужо вяліся падрыхтоўчыя работы другой чаргі аб'екта. Значыць, і ў наступным годзе тут зможа папрацаваць чарговы будаўнічы атрад.

Пра бедных студэнтаў колькі вядома жартаў! Зарабіць за месяц шмат стыпендый, пры гэтым недалёка ад дому — добры «адпачынак» падчас доўгіх летніх канікулаў. А колькі потым будзе прыемных успамінаў. Рамантыка!

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# МОЛАДЗЬ І ВЫБАРЫ

**Літаральна праз 9 дзён пройдзе важнейшая грамадска-палітычная падзея ў жыцці краіны — выбары дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў. Напярэдадні Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі пачаў Рэспубліканскі марафон «Моладзь і выбары: формула адказнасці».**

З дапамогай гэтага праекта маладзёжны саюз заклікае юнакоў і дзяўчат да палітычнай актыўнасці, павысіць свае прававыя веды, садзейнічаць развіццю маладзёжнай палітычнай культуры і ўсведамленню маладымі грамадзянамі дачынення да дынамічнага развіцця грамадства. Заклік марафону такі: «Мы вучымся, працуем, перамагаем на навуковых алімпіядах і спартыўных арэнах, выхоўваем дзяцей. Мы з'яўляемся найбольш энергічнай, прадпрымальнай часткай грамадства, рэзервам і рухальнай сілай будучага пакалення. Удзел у выбарах — гэта наш рэальны ўклад у падтрыманне міру, згоды і стабільнасці на нашай зямлі. Мы самі выбіраем, якую музыку слухаць і як апранацца. Дык навошта дазваляць іншым выбіраць нашу будучыню?!»

Тэрытарыяльныя арганізацыі БРСМ самастойна вызначаюць формы сваёй дзейнасці ў рамках марафону. Гэта могуць быць самыя розныя акцыі, флэш-мобы, якія заклікаsuccessfully заахвоціць моладзь да ўдзелу ў выбарах. Да прыкладу, мерапрыемства «Я галасую» ці «Я выбіраю» праводзіцца ў грамадскіх месцах, на вуліцах, у дамах культуры і творчасці, на спартыўных аб'ектах. Узяць удзел можа кожны. Прапанаваны адзін вялікі бюлетэнь (плакат з надпісам «Я галасую»), на якім прахожыя пакідаюць адзнаку гуашшу ці маркерам (гэта можа быць любы значок). Гэта мерапрыемства ні ў якім разе не прадугледжвае збору подпісаў у падтрымку якога-небудзь кандыдата, а заклікае да палітычнай актыўнасці. Яшчэ адзін з праектаў — «Бюлетэнь маладога выбаршчыка». Актывісты арганізацыі ў шматлюдных месцах выдаюць бюлетэнь (невялікі флайер), на якім можна пакінуць свае пажаданні будучаму дэпутату. А затым апусціць яго там жа ў «урну для галасавання». Такая, так бы мовіць, рэпетыцыя ўдзелу ў галасаванні. А ўсе пажаданні абавязкова перадаюцца ў выбарчыя штабы кандыдатаў, а найбольш арыгінальныя і цікавыя знойдуць сваё месца на старонках інтэрнэт-партала «Моладзь Беларусі». Прыгадаем яшчэ адзін праект пад назвай «Мой першы выбар». Думаю, ён спадабаецца юнакам і дзяўчатам, якія ўпершыню будуць браць удзел у выбарах. Ім будуць уручацца памятныя паштоўкі і сімвалічныя падарункі.

Формы правядзення мерапрыемстваў у рамках Рэспубліканскага марафону «Моладзь і выбары: формула адказнасці» могуць быць самымі рознымі, але мэта іх адзіная — заклікаць маладых людзей да палітычнай актыўнасці.

**Святлана СУХАРКО.**

# КОЛЬКІ СЁННЯ КАШТУЕ КУРСАВАЯ РАБОТА? А ДЫПЛОМНАЯ?

**Навучальны год толькі-толькі пачаўся, а ў інтэрнэце і ў газетах ужо размешчаны аб'явы наконт выканання і продажу курсавых і дыпломных работ. Толькі ў сталіцы падобных фірмаў налічваецца дзесяткі, калі не сотні.**

*«Наша кампанія заснаваная ў 1997 годзе. Яна мае багаты вопыт у напісанні навуковых работ рознай складанасці. Мы аказваем аўтарскую дапамогу студэнтам, аспірантам па цэламу шэрагу навуковых дысцыплін. З намі супрацоўнічаюць прафесіяналы высокага ўзроўню, якія займаюцца напісаннем не толькі аўтарскіх рэфератаў, кантрольных, курсавых і дыпломных работ, але і аўтарскіх дысертацый».*

Любая фірма, якая паважае сябе, проста абавязаная прыдумаць якасны тэкст, які дапамагаў бы прыцягваць новых кліентаў. Самае галоўнае — гэта пераканаць чалавека купіць працу менавіта ў гэтай фірме.

*«Курсавыя, лабараторныя і кантрольныя работы, дыпломы, рэфераты выконваюцца на самым высокім узроўні. Кожная работа праходзіць папярэднюю праверку. Пры напісанні ўсіх дыпломаў, курсавых, рэфератаў выкарыстоўваецца шырокае кола крыніц, уключаючы замежную літаратуру, свежыя выпускі перыядычных выданняў, манаграфіі, практычныя даныя. Усе работы выконваюцца на падставе найноўшага заканадаўства (з улікам апошніх змяненняў і дапаўненняў), навуковай і спецыяльнай навуковай літаратуры, метадычных указанняў, актуальных публікацый у навуковых перыядычных выданнях. Выкарыстанне рэфератаў з сусветнай павуціны цалкам выключаецца. Кожная выкананая работа ўнікальная, выконваецца спецыяльна і эксклюзіўна для вас. Вам таксама гарантуецца поўная канфідэнцыяльнасць на ўсіх этапах супрацоўніцтва. Падчас выканання работы ўлічваюцца ўсе патрабаванні выкладчыка. Час — гэта самая вялікая каштоўнасць на сёння. Таму кожны заказаны рэферат, курсавая або дыплом выконваюцца, як правіла, раней замоўленага тэрміну».*

Як тут не пагадзіцца і не замовіць сабе працу? Навошта марнаваць свой час, сілы і нервы? Да таго ж на сайце фірмы паведамляецца аб тым, што работу можна замовіць па любой гуманітарнай і многіх тэхнічных дысцыплінах. Аказваецца, што фірма піша работы для многіх ВНУ Беларусі і нават Расіі.

## Спосабы аплаты

Аплата работы здзяйсняецца ў два абавязковыя этапы. Спачатку трэба зрабіць перадаплату ў памеры 20—30 працэнтаў ад агульнага яе кошту. Як паведамляецца на сайце, гэта звязана з тым, што часам адбываюцца выпадкі адмовы заказчыкаў ад работ яшчэ да іх выканання. Такія выпадкі звязаныя з рознымі прычынамі. Напрыклад, заказчык сам вырашыў выканаць працу. Таксама ён можа знайсці іншую фірму, дзе паслугі будуць таннейшымі. А перадаплата служыць гарантыяй таго, што хоць частка часу, які патрачаны на напісанне работы, будзе кампенсаваная. Праўда, у такім разе існуе рызыка таго, што вас могуць проста падмануць. Аплата вядзецца толькі ў беларускіх рублях. Праўда, кошт на большасці падобных сайтаў паказаны ў доларах. Існуе некалькі спосабаў аплаты. Жыхары Мінска могуць разлічыцца наяўнымі грашыма. А вось заказчыкі з перыферыі могуць гэта зрабіць шляхам залічэння сродкаў на рахунак аднаго з паказаных на сайце мабільных тэлефонаў, а таксама праз электронныя кашалькі.

## Якія гарантыі?

Як ні дзіўна, але ўсе фірмы даюць стопрацэнтную гарантыю выканання якасных работ. Праўда, ва ўсіх рознае разуменне якасці. Таму трэба адразу ж абумовіць усе патрабаванні.

*«Мы нясём адказнасць за вынікі праведзеных прац і выкананых праектаў. Праца пішацца афіцыйна і вам гарантуецца высокая якасць і ўнікальнасць. Калі дыплом, курсавы праект, або рэферат не адказваюць патрабаванням, якія былі пазначаны ў заказе, то вам гарантуецца магчымасць бясплатна атрымаць новую работу».*

Нават у выпадку ўзнікнення якіх-небудзь недахопаў і недакладнасцяў фірма абяцае ўсё бясплатна выправіць у самыя кароткія тэрміны. Праўда, усе заўвагі павінны быць зробленыя не самім заказчыкам, а выкладчыкам або кіраўніком, які правярае работу. У адваротным выпадку заўвагі не прымаюцца. А ў «непапраўных сітуацыях», калі на выпраўленні няма часу, фірма гарантуе кампенсацыю. Кампенсацыя залежыць ад колькасці нявыкананых патрабаванняў. Але даказаць на практыцы невыкананне нейкіх патрабаванняў вельмі праблематычна. Фірма не хоча выплачваць кампенсацыю, таму вялікімі літарамі паведамляе на сайце заказчыкам, што «ўсе прэтэнзіі па якасці працы прымаюцца толькі пры наяўнасці паметак або рэцэнзіі правяраючага». А паспрабуйце растлумачыць свайму выкладчыку або кіраўніку, навошта вам рэцэнзія на сваю ж працу, якую трэба дапісваць. Фірма гарантуе канфедэнцыяльнасць выканання работ пад заказ. І яшчэ адзін нюанс. У любым выпадку абараняць работу давядзецца самому заказчыку. Калі вашу працу дапусцілі да абароны, і вы атрымалі нізкую адзнаку па прычыне няякаснага выканання, усё роўна будзе складана даказаць фірме хібы ў іх рабоце. Хутчэй за ўсё, вам адмовяць у вяртанні грошай, аргументуюць гэта тым, што вы дрэнна абаранілі работу.

Заказаць працу не складае ніякай цяжкасці. Зрабіць гэта можна праз інтэрнэт. Трэба пазначыць свае ініцыялы, тып работы (курсавая, дыпломная, дысертацыя...), тэму, ВНУ, у якой навучаецеся. Таксама неабходна пакінуць свае кантакты, пазначыць тэрміны выканання працы. І чакайце адказ.

## VIP-абслугоўванне

Чым яно адрозніваецца ад звычайнага абслугоўвання?— спытаеце вы. VIP-абслугоўванне дае шмат пераваг. Пры выкананні работы будуць улічвацца абсалютна ўсе вашыя пажаданні і патрабаванні. Спецыяльна для гэтага да вас дахаты можа прыехаць кур'ер у любы зручны для вас час. Вы можаце даць яму патрэбныя матэрыялы, спасылкі на крыніцы, якія вы хацелі б бачыць у сваёй рабоце. Для VIP-заказчыкаў гатовая работа будзе дастаўлена ў любы раён Мінска.

Ёсць і яшчэ адзін вялікі плюс. Калі вы прапусцілі практыку або проста вырашылі не праходзіць яе, то вам знойдуць падыходзячае прадпрыемства. Некаторыя фірмы гарантуюць заказчыку атрыманне пячатак прадпрыемстваў. VIP-заказчык таксама можа атрымаць вычарпальныя кансультацыі па сваёй рабоце ад кампетэнтнага ў дадзеным пытанні спецыяліста. Вам нават будзе падрыхтаваны план абароны работы ў тэзісным выглядзе, а таксама адказы на найбольш верагодныя пытанні. *«У выпадку вострага недахопу ў вас вольнага часу работа можа быць здадзеная на кафедру ВНУ без вашага ўдзелу праз кур'ерскую дастаўку»*. VIP-абслугоўванне мае і іншыя плюсы. Праўда, і каштуе работа ў такім разе, як правіла, у 1,5—2 разы вышэй.

## Колькі каштуе выкананне работы?

Курсавая работа каштуе ад 20 да 100 долараў. Кошт залежыць ад патрабаванняў і складанасці. Калі вы замовіце самы танны варыянт, то фірма не абяцае тлумачальнай запіскі. Дыпломная праца абыдзецца нашмат даражэй — ад 100 да 500 долараў. Зноў жа, кошт залежыць ад патрабаванняў. Даражэй абыдзецца дысертацыя. За доктарскую патрабуюць каля 10 тысяч долараў. Можна купіць і за пяць, і за пятнаццаць тысяч. Усё залежыць ад таўшчыні вашага кашалька і патрабаванняў. Звычайны даклад, кантрольная або лабараторная праца абыдуцца дзесьці 15 долараў. Але гэтым спіс прапануемых работ не заканчваецца. Можна заказаць рэферат, прэзентацыю, рашэнне тэстаў, напісанне шпаргалак, тлумачальнай запіскі, справаздачы па праходжанню практыкі, дакладаў, анатацый.

Час выканання работы таксама ўплывае на кошт. Чым карацей тэрміны, тым больш вам трэба будзе заплаціць грошай.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## З вопыту

Аказваецца, многія мае знаёмыя карысталіся паслугамі падобных фірмаў. Хтосьці цалкам удала, а хтосьці — не.

— Асабіста я тры разы купляў сабе курсавую работу, — кажа Дзяніс. — І ўсе тры разы быў задаволены вынікам, атрымаў максімальную адзнаку. А вось дыпломную работу пісаў сам, не хацелася рызыкаваць.

Праўда Лене пашанцавала менш, чым Дзянісу. Выкладчык адразу зразумеў, што працу пісала не яна.

— Я сама ў гэтым вінаватая. Заказала работу, мне напісалі, праўда, са спазненнем. У мяне не было часу нават на тое, каб прачытаць яе. Аказалася, што работа напісаная няякасна. Выкладчык сказаў цалкам перапісаць.

Кожны павінен выбіраць сам, што яму важней. Хтосьці сам напіша работу, зэканоміць грошы, будзе ўпэўнена трымацца на абароне. Але гэта не гарантуе высокай адзнакі. Да таго ж на напісанне пойдзе шмат часу. Праўда, і набытая праца не гарантуе высокую адзнаку. Да таго ж як вы будзеце сябе адчуваць, калі выкладчык здагадаецца, што работу выконваў хтосьці іншы. Уяўляю, як шкада вам будзе патрачаных грошай! Так што ў любым выпадку выбар за вамі. Але калі вы адназначна вырашылі, што будзеце звяртацца па дапамогу, то шукайце надзейныя фірмы. Для гэтага спытайцеся ў сваіх знаёмых, можа, яны вам нешта параяць. Ці ўсё ж лепш рабіць усё самому?

**Сяргей ДЗЕВЯТОЎСКІ.**

# Гранаты, камбайны і «Гітлер капут»

**18 верасня адбылася сусветная прэм'ера фільма камедыі Маруса Бальчунаса «Гітлер капут!». Непасрэднае дачыненне да фільма маюць і беларусы — а калі канкрэтна, гомельскі калектыў «Гарадскі сум». Менавіта яго кампазіцыя «Гомель — Гановер», запісаная разам з нямецкім гуртом «Federation», стала саўндтрэкам да кінастужкі. Да таго ж беларусам практычна за здорава жывеш дастаўся кліп з кадрамі з фільма.**

Фільм, які стваральнікі характарызуюць як «сучасную камічную версію «17 імгненняў вясны», практычна пачынаецца з песні беларускага гурта — у яе суправаджэнні ідуць тытры і першыя кадры. Што адметна, сама песня «Гомель — Гановер» з'явілася на свет даволі даўно — выйшла на альбоме «З мірам» у 2004 годзе. Нямецкія і беларускія музыканты пазнаёміліся па міжнароднай маладзёжнай праграме абмену музыкай, і разам запісалі кампазіцыю. А цяпер вось яна чымсьці прыцягнула ўвагу маскоўскай студыі «Кінасфера». «Нам патэлефанавалі, спыталі, ці не будзем супраць, калі возьмуць нашу песню ў фільм, — прыгадвае лідар гурта Аляксандр Госцеў. — Безумоўна, мы былі толькі «за»!».

У абмен музыканты прыехалі ў Маскву, паглядзелі фільм і выбралі сабе мноства кадраў для будучага кліпа — прычым адабралі разоў у 10 болей, чым спатрэбілася ў выніку. А вось саму кампазіцыю для відэаароліка давялося перапісаць — каб была «без немцаў». Нямецкія музыканты і самі адмовіліся ад удзелу, калі даведаліся, пра што фільм. Таму песня стала цалкам рускамоўнай, а сюжэт — набліжаным да фільма.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

# «ДЗЯСЯТЫ КЛАС КЛІЧА Ў РЭСТАРАН, А АДЗІНАЦЦАТЫ...»

**Кожны выбірае свой напрамак. Будуе ўласнае жыццё. Піша сваю гісторыю. Так цікава праз нейкі час сустрэцца і ўспомніць былое, а пасля распытаць пра сучаснае...**

Святлана — мая даўняя знаёмая. Згубілі кантакты. Кожны пайшоў сваім шляхам. Сустрэліся выпадкова. Той жа запал у вачах, але нешта змянілася... Можа, мудрасць з'явілася? Аказалася, ёсць прычына. Сёння былая свавольніца вучыць дзяцей. Яна — Святлана Пятроўна Шапель — настаўніца рускай мовы і літаратуры.

Не гэта здзівіла мяне. Здзівіла тое, што дзяўчына з задавальненнем (?!) кожны дзень ездзіць з Полацка (роднага горада) у вёску Астроўшчына ў звычайную агульнаадукацыйную сярэднюю школу. Проста немагчыма было не распытаць пра лёс.

Падчас вучобы ў школе дзяўчына марыла стаць бухгалтарам. Пазней згадзілася з парадай маці: лепш сядзець за сшыткамі, чым за камп'ютарам, і пайшла вучыцца, каб пасля вучыць іншых, у Полацкі дзяржаўны педагагічны каледж імя Ф. Скарыны. Больш за ўсё ў школе Святлане падабаліся руская мова і літаратура. Свой выбар на іх яна і спыніла.

Год таму Святлана стала выпускніцай каледжа з дыпломам. Былая настаўніца Светы па рускай мове і літаратуры, Алена Віктараўна Вількова, дапамагла дзяўчыне ўладкавацца на працу ў вёску Астроўшчына. Там Алена Віктараўна некалі расла, вучылася і працавала.

Святлане 21 год, яна — самая маладая настаўніца ў школе. Выкладае рускую мову і літаратуру ва ўсіх класах з 5-га да 11-га. Да таго ж яна — класны кіраўнік 9-га класа. У яе нават ёсць свой асабісты кабінет. Дырэктар школы, Юрый Хрол, хваліць дзяўчыну: «Яна — малайчына. Не спужалася цяжкасцяў. Даказала вучням, што ведае больш за іх і што яны павінны браць з яе прыклад. Не пабаялася сялянскага побыту. Як і ўсе, увосень выязджае капаць бульбу, працуе разам з дзецьмі. Яе не напужала нават тое, што ў школе адсутнічае каналізацыя».

Дырэктар упэўнены, што ў хуткім часе Святлана стане настаўніцай з вялікай літары. Ужо сёння паказчыкі па рускай мове сталі лепшымі.

Дзяўчына задаволеная. Што трэба для добрай работы? Галоўнае для Светы — добры калектыў — ён ёсць. Паслухмяныя (можа, і не заўсёды) дзеці — таксама. Нават жыллё школа выдзеліла. Праўда, Святлана пакуль ездзіць кожны раз дамоў, у горад, да бацькоў. Здаецца, так прасцей. З іншага боку, яна кожны дзень на гадзіну больш траціць на шлях да працы і назад. У яе ўласны аўтамабіль, а гэта каля 10 тысяч рублёў на бензін кожны дзень.

Галоўнае ж — вучні. З імі заўсёды цікава. Тым больш, калі настаўніца — прыгожая дзяўчына. Як кажа Света, «дзясяты клас запрашае ў рэстаран, а адзінаццаты кліча замуж». Для настаўніцы ж яны ўсё роўна вучні. Усе аднолькавыя. Нават «любімчыкаў» няма. Галоўнае, каб дзеці добра вучыліся і засвойвалі матэрыял.

Цікава, што маладога спецыяліста запрашалі працаваць у навапалацкую школу настаўнікам пачатковых класаў. Яна адмовілася. «Навошта? Тут і калектыў добры, і ўмовы». У бліжэйшы час дзяўчына нават не думае пра тое, каб змяніць месца працы. Яна завочна атрымлівае вышэйшую адукацыю ў Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце імя М. Танка. У планах — скончыць універсітэт. Пасля можна пашукаць добрага і вернага сябра жыцця. Сэрца не занятае, а для будучыні ёй хочацца такога простага жаночага шчасця — каб сям'я была моцнай ды каб жыць у дастатку... Зараз з ёй побач яе вучні і любімыя Ясенін з Забалоцкім...

**Дар'я ПРЫШЧЭПАВА.**



# «ПАМЯТНЫЯ ЗНАКІ НЕАБХОДНА АДКРЫЦЬ І Ў ІНШЫХ МІКРАРАЁНАХ ГОРАДА!..»

**На мінулым тыдні ў сталічным раёне Сухарава адбылося ўрачыстае адкрыццё памятнага знака, прысвечанае 505-й гадавіне з дня заснавання паселішча. Аб першых успамінах у пісьмовых крыніцах Сухарава, аб яго гістарычным развіцці і сучасным стане нам паведаміў выдатны гісторык, археолаг, дацэнт Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка Леанід КАЛЯДЗІНСКІ.**

— Упершыню Сухарава ўпамінаецца 3 жніўня 1503 года ў Метрыцы Вялікага Княства Літоўскага як маёнтак Багдана Карэйвіча, які перайшоў яму ад бацькі — пана Карэйвы. Той жа ў свой час атрымаў гэтыя землі за пэўныя заслугі ад Вялікага князя Літоўскага Жыгімонта Старога (1467—1548). З чаго можна зрабіць выснову, што ў канцы XV стагоддзя гэтае паселішча ўжо існавала.

Але дзякуючы археалагічным знаходкам, мы маем падставу аднесці ўзнікненне Сухарава да больш ранняга перыяду. Падчас будаўніцтва адным з жыхароў была знойдзена каменная сякера. Звычайна такія сякеры трапляюцца археолагам у пахаваннях III—II тысячагоддзяў да нашай эры (эпоха неаліту). На жаль, не захавалася ні імені, ні прозвішча гэтага чалавека, таму гэта ў некаторым сэнсе страчаная інфармацыя.

Наступны перыяд — ранні феадалізм. Паводле слоў старажылаў вёскі Сухарава, на месцы, дзе сёння размешчаны будынак «НВА» «Цэнтр», некалі ўзвышалася гара. Мясцовае насельніцтва называла яе Манастырскай з-за манастыра, які стаяў на ёй. Вядома, что што такія манастыры будаваліся на месцы былых свяцілішчаў у Кіеве, Тураве, Ноўгарадзе.

Аднак найбольш поўную інфармацыю пра ранні перыяд Сухарава нам даюць курганныя насыпы, размешчаныя на тэрыторыі былых вясковых могілак XIX—XX стст. У 1995 годзе я з групай студэнтаў правёў археалагічныя раскопкі на адным з гэтых курганоў, падчас якіх быў знойдзены матэрыял, які можна аднесці да XI—XII стст. Магчыма адсюль пайшла і назва паселішча, якое было заснавана на высокіх пясчаных сухіх пагорках.

***— Вёскі Сухарава на сёння ўжо няма. Як адбываўся працэс яе ўрбанізацыі?***

— Вёскай Сухарава лічылася да 1998 года. Менавіта тады рашэннем Савета Міністраў Беларусі яна была ўключана ў гарадскую мяжу. Так скончылася гісторыя вёскі і пачаўся яе гарадскі этап. Яшчэ 10 гадоў таму тут былі свае старажылы, якія, на жаль, ужо адыходзяць у іншы свет. На месцы былых сялянскіх хатак узводзяцца катэджы, шматпавярховыя дамы. Пры будаўніцтве людзі забываюцца на гісторыю, пад бульдозерам знішчаюцца сапраўдныя каштоўнасці, тое, што магло б стаць спадчынай для нашчадкаў. Вёскі няма, і напамінаў аб ёй таксама. Яе побыт паступова размываецца. Тут і ўзнікае актуальнае пытанне: як захаваць хоць кавалачак гісторыі? А гэта ўжо работа школьнікаў, настаўнікаў, аматараў краязнаўства. Неабходна збіраць рэчы матэрыяльнай культуры, фотаздымкі, архіўныя дакументы, размяшчаць іх у музеях.

***— Каму належыць ідэя адкрыцця памятнага знака?***

— Задумка гэта мая. Так атрымалася, што я жыхар гэтага раёна. І мне не абыякавая гісторыя месца, дзе я жыву. Гэта ўжо прафесійная рыса. Проста пайшоў у Адміністрацыю Фрунзенскага раёна ў ідэалагічны аддзел. Там вельмі прыязна аднесліся да маёй прапановы, выдзелілі неабходныя сродкі, устанавілі знак, прымацавалі дошку, правялі ўрачыстае адкрыццё. Сабралася каля 100 чалавек: школьнікі, прадстаўнікі адміністрацыі. Я вельмі задаволены.

***— Ці лічыце вы мэтазгодным рабіць тое ж самае і ў іншых мікрараёнах Мінска?***

— Гэта проста неабходна! Я заклікаю сваіх калег — гісторыкаў і археолагаў — рабіць тое ж самае. Малінаўка, Зялёны луг, Чыжоўка, Серабранка, Шабаны — гэта ўсё — назвы былых вёсак, на якіх заснаваны мікрараёны. Трэба заняцца вывучэннем гэтых рэгіёнаў, адшукаць, калі ўпершыню яны ўзгадваюцца ў пісьмовых крыніцах, устанавіць памятныя знакі, данесці гэтую інфармацыю да насельніцтва. Не трэба забывацца на сваё, беларускае, захоўваць свае спрадвечныя назвы. Чамусьці ўсё часцей нашыя крамы называюць «Максімус» ці «Вэстэр». Не кожны нават ведае, што гэта абазначае. Чым дрэнная назва «Пан Карэйва» для буйнога гандлёвага цэнтра? Наша далейшае духоўнае існаванне залежыць толькі ад нас саміх і ад нашай веры ў саміх сябе.

**Ірына БАГАМОЛАВА.**

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.




# Горад

**«Я люблю гэты горад! Ён самы лепшы! Мне падабаецца тут жыць!..». Як часта можна пачуць падобныя фразы, а ці так гэта насамрэч?**

Няўжо можна яго любіць і кожны дзень з глыбокай пашанай заміраць перад ім? Я ў гэта не веру.

Нельга любіць горад як адно цэлае з усёй яго вялікай колькасцю жалеза і бетону, заводамі, аўтамабілямі, трамваямі...

Нельга любіць горад з яго безаблічнай масай людзей, якія, як робаты, перамяшчаюцца па заранёй зададзеным маршруце на працу, а ўвечары ідуць у адваротным накірунку. У гэтым выпадку ёсць два варыянты: ці паўтараюць ранішні маршрут у люстэркавым адбітку, або з'яўляецца ў ім, адбітку, будынак з надпісам «Віна-гарэлачныя вырабы». І даводзіцца кожны дзень зліваццa з шэрай масай, раствараючыся ў ёй. А гэта не складана. Іх намнога больш, чым мяне. І часам сярод іх можна ўявіць сябе адным з герояў фільма «The Wall», напрыклад, у гадзіну пік у метро. Пераходзіш ты з адной лініі на другую, ідзеш, заціснуты з усіх бакоў людзьмі, якія рухаюцца амаль сінхронна, становішся на эскалатар, едзеш. І ўвесь гэты час у любімым плэеры гучыць песня «Another Brick in The Wall»... А бывае так, што плэер не грае — парваліся навушнікі, села батарэйка ці нешта іншае стала прычынай цішыні... Тады сапраўды становіцца дрэнна. Вось у гэтай бабулі, у адрозненне ад яе суразмоўцы, не выдаўся дачны сезон, а вось гэтыя маладыя людзі лічаць, што лепш за ўсё слухаць музыку на мабільным тэлефоне і «частаваць» ёю ўсіх навакольных... Вой, мадам, прынамсі, непрыстойна ў людным месцы гучна расказваць сваёй сяброўцы такія рэчы пра свайго каханага! І не хочаш пра ўсё гэта ведаць, а становішся міжвольным слухачом.

Нельга любіць горад як адно цэлае. Можна любіць пэўныя месцы, з якімі нешта звязана. І асабіста для мяне не так важна, якія гэта ўспаміны: добрыя ці кепскія, галоўнае штосьці адчуваць, бо абыякавасць горш за ўсё. А можа быць так, што ніякія ўспаміны і не звязваюць цябе з гэтай вуліцай, з тым паркам, бульварам, завулкам, дзе табе хораша. Ты сам прыдумаў і пераканаў сябе, што лепшага месца не бывае. Ты верыш у гэта, прыходзіш туды час ад часу, і табе падабаецца там бываць.

А можна любіць час сутак. Горад паўстае зусім іншым, калі ідзеш позна ўначы, удалечыні ад галоўных вуліц і праспектаў, дзе нават глыбока за поўнач бывае шумна і светла. Цьмяныя ліхтары ледзь асвятляюць вуліцу нейкім матавым святлом, чутны лёгкі шум ветру. Дамы ўжо не свецяць шматлікімі вокнамі, засталося толькі адно, два... няшмат засталося вокнаў, якія свецяцца. І цяпер іх святло не здаецца такім прыгнятальным, якім яно было некалькі гадзін таму, калі іх было шмат.

Любіць горад, у якім ты нарадзіўся, — ён стаў тваёй малой радзімай і толькі таму, любіць горад, дзе твой дом. Дом — не збудаванне з бетону, цэглы ці чагосьці яшчэ, а проста дом, куды хочацца заўсёды вярнуцца...

Але нельга любіць горад як адно цэлае!

Нельга...

**Андрэй БЫЛІНА.**

Выпрабавана на сабе

# ЯК Я ПРАДАВАЎ ПАМІДОРЫ

**Карэспандэнт «Чырвонай змены» ў чарговы раз змяніў прафесію. Працаваў ён прадаўцом.**

## Як я ўладкоўваўся на працу

Не, гэтым разам у мяне не было доўгіх пошукаў патрэбнай вакансіі, як і працяглых гутарак... Не давялося нават шукаць прапаноў, каб уладкавацца працаваць. Праца знайшла мяне сама.

Як вы ўяўляеце работу прадаўца? Асабіста мне раней гэтая прафесія здавалася не толькі цікавай, але і вельмі прывабнай. Стаіш сабе, ды прадаеш тавар. Можна і кнігу пачытаць у вольны час. Толькі трэба заўсёды ўсміхацца пакупнікам.

У адны з выхадных я адправіўся ў госці да сваёй бабулі. Аказалася, што сёлета ў яе вялікі ўраджай таматаў.

— І што я буду з імі рабіць? Ужо і суседзям частку раздала, і нікому яны ўжо не патрэбныя. Выкідваць, ці што?

— Як выкідваць? Гэта ж твая праца! — кажу я.

Нашу гутарку пачула суседка, якая прапанавала адвезці гародніну на рынак.

— Пастаіш, Сяргей, ды і прадасі за дзень. У выхадныя людзей шмат на рынку, — сцвярджала яна. — Сама часта езджу тое-сёе прадаваць.

Бабулі не вельмі спадабалася прапанова, але мяне гэтая ідэя зацікавіла.

## Прывітанне, рынак!

Што я магу з сабою зрабіць, калі мяне заўсёды вабіць усё новае. Вось і на гэты раз я не ўтрымаўся ад магчымасці пагандляваць на рынку таматамі. Для гэтага мне трэба было ўстаць у пяць гадзін раніцы, каб паспець на цягнік. Бабуля ўжо сабрала мне сумку з таварам.

Такім чынам, я ў цягніку. Праз сарок хвілін прыбываю ў горад Н. Іду на рынак, які адкрываецца ў сем гадзін. Падыходзячы, бачу, што народ ужо чакае адкрыцця.

— Саша, глядзі, каб паспеў заняць месца за тым столікам, — гаварыла жанчына хлопцу, які візеў на плоце. Візеў у прамым сэнсе слова.

«Не, я не буду пераскокваць праз плот, гэта ж некультурна», — падумаў я. Аб тым, як жа я памыляўся, зразумеў пазней. Ні пра якую культуру тут не магла ісці і размова.

У сем гадзін адкрылі вароты, але праз іх мала хто ўвайшоў. Большасць людзей проста пераскочыла праз плот і пабегла займаць месцы. Мне пашанцавала, я знайшоў яго, але тут падбегла бабулька і пачала нахабна мяне праганяць.

— Вася, стаў сюды вядро! — камандавала яна. — Ідзі яшчэ па адно.

Я так і стаяў, здзіўлены паводзінамі бабулі.

— Жанчына, тут я стаю! Вы не бачыце? — спрабую абараніць сваё месца.

— Дзе ты стаіш? Не бачыш, тут маё вядро стаіць?

Спрабую спакойна растлумачыць ёй, што я раней заняў гэтае месца. У мяне нічога не атрымліваецца. Праз некалькі хвілін да нас падбеглі яшчэ дзве бабулі, якія заступіліся за сваю калегу і сяброўку.

— Хлопец, як ты размаўляеш са старэйшымі? І не сорамна табе хлусіць? Каця тут даўно стаяла! А тут ты прыйшоў, — пачалі тыя крычаць на мяне. Мне нічога не заставалася рабіць, як шукаць сабе іншае месца.

Але зрабіць гэта аказалася нялёгка. Усюды ўсё было ўжо занята, альбо «выкуплена».

Тады я вырашыў паклікаць сабе на дапамогу каго-небудзь з адміністрацыі рынку. Якраз каля гандлёвых радоў бегала жанчына, якая і камандавала ўсімі.

— Сюды не трэба станавіцца, зараз паедзе машына. Потым станеце, пазней, — гаварыла яна.

Я папрасіў яе знайсці мне месца. Яна дапамагла. Для гэтага давялося пацясніць бабулек на гандлёвых радах.

— Чаго крыўдзіце мне хлопца? — спытала ў тых адміністратар. — Сумленне трэба мець!

Было відаць, што бабулькі не вельмі радаваліся майму прыходу. Тут жа пачалі са мной сварыцца. Гэтым разам я не вытрымаў, маё цярпенне лопнула. Давялося ім пасунуцца і саступіць мне месца, што не склала, як аказалася, вялікіх намаганняў.

Цяпер трэба было несці тавар на экспертызу. Для гэтага трэба ўзяць адзін плод і аднесці ў лабараторыю.

— Давай спачатку я аднясу свой тавар на экспертызу, а ты паглядзіш за прылаўкам, а потым ты сходзіш. Дамовіліся? — спытала ў мяне бабуля-суседка. Я пагадзіўся.

У лабараторыі была чарга, давялося пачакаць. У нейкай кнізе запісалі мой адрас.

— Колькі кілаграмаў прывезлі прадаваць? — спыталі ў мяне.

— Не ведаю... Кілаграмаў дваццаць, — адказваю я.

— Навошта трэба было гаварыць столькі, мог бы і схлусіць, сказаць менш. Усё роўна ніхто не правярае! — параіла мне жанчына, якая стаяла за мной у чарзе.

## Гандаль пачаўся!

Усё, я стаю за прылаўкам, тавар раскладзены, экспертыза пройдзеная. Засталося чакаць пакупнікоў. А яны не спяшаліся на рынак.

— Нічога, сёння субота, людзей павінна быць шмат. Прададзім увесь тавар! — гаварыла мне суседка. Яе словы абнадзеілі мяне.

Бліжэй да дзесяці гадзін рынак ажыў. Паўсюль стаяў гул. Здавалася, што дзесьці побач лятае рой пчол.

— Колькі каштуе кілаграм таматаў? — пацікавіліся ў мяне. Я адказаў.

— Дорага! — пачуў у адказ.

— Што значыць — дорага? А вам бясплатна можа яшчэ іх аддаць? Вы ведаеце, колькі працы трэба, каб таматы выраслі? — не вытрымліваю я. У адказ цішыня.

Потым быў часовы перапынак, ніхто не падыходзіў. Я паспеў разгледзець прадаўцоў. У асноўным гэта былі бабулі. Была і моладзь, але не так шмат. Некаторыя прадаўцы сядзелі і чакалі пакупнікоў, а некаторыя не спадзяваліся на поспех, а актыўна запрашалі людзей па пакупкі. Часцей за ўсё гэта спрацоўвала. Мне стала нават цікава самому паспрабаваць запрашаць пакупнікоў.

— Купляйце таматы хатнія. Не праходзьце міма...— гаварыў я. Пакупнікі сталі звяртаць на мяне ўвагу.

— Які малады хлопец, трэба купіць у яго таматаў, — гаворыць адна жанчына.

Ура! Першы кілаграм прададзены. Лаўлю на сабе зайздросныя погляды бабулек.

Паступова гандаль пайшоў. Людзі сталі цікавіцца маім таварам. Праз паўгадзіны актыўнага заманьвання пакупнікоў у мяне стаў балець язык. Многія цікавіліся коштам, але мала хто купляў. Камусьці таматы здаваліся занадта дробнымі, камусьці — занадта вялікімі. Тады я зразумеў значэнне выказвання, што «пакупнік — кароль рынку, ён заўсёды мае рацыю». З гэтым і не паспрачаешся. Калі хтосьці лічыць, што таматы, напрыклад, занадта дробныя, то ўжо ніяк не прымусіш купіць іх.

— Нейкія ў цябе, хлопец, непрыгожыя таматы! — кажа жанчына.

— А што ў вашым разуменні ёсць прыгажосць? Якія крытэрыі прыгажосці таматаў? — пытаюся я. Было бачна, што жанчына не чакала пачуць такое пытанне ад прадаўца. Яна толькі ўсміхнулася і пайшла далей.

Нічога, здавацца я не збіраўся. Ужо было прададзена чатыры кілаграмы. Я пачаў з новай сілай запрашаць пакупнікоў. Цікавіліся многія таварам, але параненйшаму мала хто купляў. Было вельмі цікава назіраць за тым, як людзі выбіраюць. Вось у бабулі, якая сядзіць побач, купляюць кроп. Усе задаволеныя: і бабуля, і пакупнік. Але тут раптам жанчына, якая купіла кроп, вяртаецца і пачынае крычаць, што ёй няправільна далі рэшту.

— Вы мяне аблічылі! Вы далі мне на тысячу менш!

Пачаліся разборкі. Спачатку гэта было цікава, але потым ужо было не да смеху. Жанчыны завяліся не на жарт. Бабуля ў рэшце рэшт вырашыла аддаць гэтай жанчыне тысячу. Хоць да апошняга была ўпэўненая ў сваёй правільнасці.

Тут раптам адна з маіх суседак стала вохкаць і ахкаць, што яна замест тысячы дала пяцьдзесят. Пратаргавалася на сорак дзевяць тысяч.

— Ужо ніхто не верне мне грошы, — гаварыла яна. Але праз некалькі хвілін прыйшла маладзіца і аддала.

Тут падыходзіць жанчына з адміністрацыі.

— Аплачвайце месцы! — кажа. — Нешта я вас бачу першы раз. Ці я памыляюся?

— Не, я насамрэч першы раз, вы не памыляецеся!

Неяк пацяплела на вуліцы. Гандаль пайшоў больш актыўна. Я зноў стаў запрашаць пакупнікоў. Яшчэ пяць кілаграмаў прададзена.

— Табе б, хлопец, лепш вучыцца або працаваць ісці, а не на рынку сядзець! Рана табе яшчэ гандляваць. У наш час трэба мець адукацыю, — гаворыць мне адна жанчына. Як ні дзіўна, мяне гэта нават не закранула. Наадварот, мне стала цікава.

— Не ўсім жа быць навукоўцамі, трэба камусьці і гандлем займацца, — адказваю ёй. Пры гэтым думаю, што ведала б яна, кім я працую, то не гаварыла так.

На рынку неяк стала менш людзей. У мяне з'явілася магчымасць паглядзець па баках. У гэты час мяне паклікала бабуля, якая сядзела злева ад мяне.

— Прыгожыя ў вас таматы. Купіла б, калі б грошы былі, — сказала яна. — Я сама прадаю кветкі, але пакуль што ніхто нічога не купіў. Далей яна стала скардзіцца на свой лёс. І тут раптам я ўспомніў, што мая бабуля заўсёды вырошчвае шмат кветак.

— Давайце абмяняемся: я вам дам таматы, а вы мне кветкі, — кажу суседцы. Тая згаджаецца, дамова ўсім падабаецца.

## Высновы

На гэтым мая праца прадаўцом скончылася. Безумоўна, гандляваць на калгасным рынку — гэта не тое ж самае, што працаваць у якім-небудзь сталічным магазіне. Тут ёсць шмат сваіх нюансаў. Купляюць у таго, хто больш за ўсіх зазывае пакупнікоў. А для таго, каб заняць зручнае для гандлю месца, трэба крыху павісець на агароджы. Сваю сумленнасць неабходна схаваць крыху далей, інакш табе не будзе месца на рынку. Адну жанчыну так пакрыўдзілі, што тая са слязамі на вачах гандлявала хвілін дваццаць, а потым увогуле вырашыла пайсці куды далей. Я прадаў практычна ўсе таматы, калі не лічыць абмен на кветкі. Мая бабуля вельмі здзівілася, што ў мяне нешта атрымалася.

— Можа, ты нічога не прадаў? Можа, гэта твае ўласныя грошы? — пыталася яна.

**Сяргей ДЗЕВЯТОЎСКІ.**

Вандроўкі

# СУСЕД ПАЗНАЕЦЦА Ў ПАРАЎНАННІ!

**З моманту распаду СССР прайшло не так ужо і шмат гадоў. Але цяпер мы адзін аднаму — замежнікі і таму вывучаем кожнага з яшчэ большай скрупулёзнасцю. А каб лепей пазнаць і зразумець свайго суседа, вядома ж, неабходна параўнанне з самім сабою. «А як у вас?», «А пачым у іх?». Вось і паспрабавалі мы параўнаць сталіцу нашай радзімы, Мінск, з галоўным горадам суседкі-Украіны — Кіевам. І аб'ектыўнасці дзеля — без усякай палітыкі.**

## Кіяўляне

Для пачатку, кіяўляне па колькасці пераўзыходзяць мінчан: 2,6 млн супраць 1,9 млн. Аднак, па неафіцыйных даных, горад на Дняпры насяляе каля 4 млн чалавек.

Але гэта ўсё лічбы. Сонечны мегаполіс сустрэў нас знясільваючай спякотай +34° С, у той час як у Мінску было ўсяго +15. З непадробным патрыятызмам кіяўляне, абгарнуўшыся ў блакітна-жоўтыя сцягі сваёй краіны, шпацыравалі па горадзе — Дзень Незалежнасці. На выхадныя Крашчацік — цэнтральная вуліца — ператвараецца ў пешаходную вуліцу. Вось хтосьці спявае народныя песні, далей танцуюць брэйк-данс, грае аркестр. А вось і вулічны прамоўца: нейкі мужчына стаіць на ўзвышшы і з бурнымі эмоцыямі чытае неперакана́ўчую пропаведзь аб згубе ўсяго чалавецтва...У нас такога сапраўды не ўбачыш.

Аднак бруд, які пакідаюць пасля сябе кіяўляне ў цэнтры горада, проста шакіруе. Адчуванне, што мангола-татарскае нашэсце не так даўно і скончылася. І так кожныя выхадныя.

Кіеў прыемна здзівіў мноствам фантанаў. У такую спякоту яны проста неабходныя. Нягледзячы ні на што, горад на Дняпры можа не проста парадаваць, але і незнарок развесяліць. Цікава назіраць за міліцыянерамі, якія адзначылі свята Дзень Незалежнасці і адначасова ахоўвалі рэзідэнцыю Прэзідэнта...

## Знак горада з'ела моль

Здаецца, не так даўно ў інтэрнэт-супольнасці вялі дыскусію на тэму «Што ж з'яўляецца знакам Мінска». Так да адзінага меркавання і не прыйшлі. Што датычыцца Кіева. Магчыма, для турыстаў з нядаўніх часоў знакам стаў майдан і аранжавая рэвалюцыя. Для іншых засталіся Кіева-Пячэрская лаўра, Крашчацік, Сафійскі сабор, Днепр.... Але для карэнных жыхароў знак Кіева — каштаны. Дарэчы, да восеньскага лістапада было яшчэ даволі далёка, але шматлікія сталічныя каштаны ўжо пажоўклі. Знакі горада не хварэюць, іх есць «каштанавая моль». Цяпер усім горадам вырашаюць, як ад яе пазбавіцца...

## Транспарт

Пры адсутнасці асабістага кабрыялета даводзіцца карыстацца грамадскім транспартам. Дык вось, метро, аўтобус, тралейбус, трамвай каштуюць 50 грыўняў (гэта прыкладна 200 беларускіх рублёў). Нам пра гэта застаецца толькі марыць. А пра метро варта сказаць асобна. Паперашае, яно значна глыбейшае за мінскае: адзін толькі спуск або ўздым займае ад 3 да 5 хвілін. Па-другое, метро складаецца з 3 ліній, што дазваляе дабрацца ў любую кропку горада. А вось усе станоўчыя эмоцыі з наземным транспартам псуюць пастаянныя заторы. Але з усяго можна атрымаць карысць. Напрыклад, бавячы хвіліны або гадзіны ў заторах, можна разглядаць і вывучаць неверагодную колькасць прыгожых дарагіх аўтамабіляў.

## Дзе жыць

Калі вас настолькі зачараваў Кіеў і жаданне застацца тут назаўжды перасіліць вы не можаце, не хвалюйцеся. Хуткае працвераджэнне магчыма, даведаўшыся пра кошты на жылую плошчу. Кошт на аднапакаёвую кватэру на ўскраіне горада пачынаецца ад 100 000 $. У цэнтры Кіева аднапакаёвую можна купіць і за 1 250 000$.

Зняць аднапакаёвую кватэру можна за 350—400$. Калі захочаце побач з лініяй метро — будзьце гатовыя выкласці ўсе 500—600$. І гэта пры тым, што сярэдняя зарплата ў Кіеве 520$.

Дарэчы, Кіеў на 2-м месцы па кошце нерухомасці ў СВЕЦЕ (1-е — Масква). Гэта завецца: мы бедныя, але дарагія.

## Крамы

Неверагодная колькасць невялікіх крамаў, супермаркетаў (некалькі працуюць кругласутачна), гіпермаркетаў проста шакіруе. Нават уздоўж усяго Крашчаціка абапал вуліцы адзін за адным крамы, крамы... Выбар непараўнальны на любы густ і матэрыяльны ўзровень. І дарэчы, кошты прыкладна аднолькавыя. А калі гаварыць аб вопратцы: розніца толькі ў тым, што ў Кіеве рэчы фірмовыя і якасныя. Ды і распродажы наладжваюць часцей, плюс разнастайныя святочныя зніжкі.

## Падагульнім

На чыю карысць параўнанне? Пытанне спрэчнае. Кожны чалавек выбірае месца жыхарства згодна са сваімі запатрабаваннямі і пажаданнямі. Галоўнае — любіць гэтае месца. А ацэньваць краіны, гарады (вялікія і маленькія), людзі будуць заўсёды. Так ужо ўладкавана наша псіхалогія.

**Ірына ЛЯШКЕВІЧ.**



Фестывалі

# Магчымасць глядзець на іншых

**Кінафестываль «Лістапад» па традыцыі збярэ фільмы, якія ўжо атрымалі прызнанне на буйных кінафорумах свету ці ў сваіх краінах.**

«Час хваляванняў надыходзіць, — канстатаваў старшыня Мінскага міжнароднага кінафестывалю «Лістапад» народны артыст СССР Расціслаў Янкоўскі. — Сёлета мы чакаем сустрэчы з пятнаццатым, юбілейным фестывалем. Калі задумацца, колькі падзей адбылося за гэтыя гады, то дзіву даешся: пачаўся наш кінафорум з непрафесійнага, аматарскага падыходу. Далей ён разрастаўся і сталеў, сталі працаваць у адной камандзе з Валянцінай Сцяпанавай, бліскучым дырэктарам. Цяпер мы маем Мінскі міжнародны кінафестываль. І я чуў меркаванне, што можна ўжо зрабіць яго ўсебеларускім. Ды ці трэба, ці правільна гэта? Ёсць брэнд, ёсць марка, якую ўжо ведаюць у Еўропе. Яе трэба захоўваць. Дзякуй Богу, Міністэрства культуры падтрымлівае нас, і Мінскі гарвыканкам, які робіць шмат, каб годна прыняць гасцей».

І вось тут пачынаецца самае складанае, калі разумееш, колькі гасцей прыедзе ў нашу краіну толькі дзеля такой важнай справы, як кіно. Сёлета на фестывалі будуць прадстаўлены кінапрацы з 55 краін — у конкурсных і па-за конкурсных паказах. У конкурснай праграме мастацкіх фільмаў нам пакажуць 20 стужак з 19 краін свету. У праграме негульнявога кіно іх будзе 20 з 11 краін. Але сёлета з'віцца яшчэ конкурс тэлевізійных фільмаў — іх чакаецца 14 з 9 краін. А яшчэ ж ёсць дзіцячы «Лістападзік», дзе лічбы таксама ўнушальныя... Цікава, што сёлета будзе даволі прадстаўнічая пазаконкурсная праграма: 19 фільмаў з 11 краін. Ёсць думка кожны дзень пачынаць адным пазаконкурсным фільмам — ужо надта добрыя працы і выдатныя рэжысёры будуць прадстаўлены ў Мінску.

— Прыедзе Кшыштаф Занусі і, магчыма, Эміль Кустурыца. Калі атрымаем яго фільм «Марадона» — для нас гэта будзе вялікая радасць, — гаворыць Расціслаў Янкоўскі. — Не так мы спешчаныя прыездам вялікіх майстроў. Гэта для нас заўсёды вялікі падарунак. Акцёры знакамітыя, вядома ж, прыедуць. Мы з задавальненнем вітаем заслужаных асобаў. Але мне хацелася б, каб да нас прыязджала больш моладзі. Толькі ёсць «але». Сёння прыйшоў у гэтую прафесію прагрэс і ўсё часцей гучыць слова «мані». Грошы на ўсё патрэбныя. Вядома, людзі, якія вельмі запатрабаваныя і занятыя, не проста так прыязджаюць да нас на фестываль. Іх трэба задзейнічаць — у канцэртах, сустрэчах. Так адбываецца не толькі ў нас. Я ведаю, што Мікіта Міхалкоў танчыць, калі да яго на Маскоўскі кінафестываль едуць сусветныя зоркі. Наконт таго, хто прыедзе на «Лістапад», мы яшчэ вядзём перамовы.

Гэта пацвердзіла дырэктар фестывалю Валянціна Сцяпанава. Прыедуць прадстаўляць свае фільмы іх стваральнікі з многіх краін свету. Як і госці нас наведаюць не толькі расійскія: Івар Калныньш, Данатас Баніёніс, Барбара Брыльска...



Фота Пятра ФАМІНА.

— Галоўнай задачай Мінскага кінафестывалю было падтрымаць наша нацыянальнае кіно, — падкрэсліла Валянціна Сцяпанава. — Летась мы адважыліся і зрабілі конкурс негульнявога кіно, дзе пазіцыі Беларусі вельмі моцныя і гэта засведчылі вынікі конкурсу. Сёлета мы таксама правядзём фестываль негульнявых фільмаў. І гэтым не абмяжуемся. «Лістапад» працягвае пашырацца і геаграфічна, і творча — упершыню з'явіцца конкурс тэлевізійных фільмаў. Мы, як і раней, імкнёмся атрымаць у праграму тыя фільмы, якія знайшлі прызнанне на іншых кінафестывалях ці ў сваіх краінах. Дапамогу ў гэтым нам аказваюць пасольствы Беларусі ў іншых краінах.

Такім чынам, да «лістападаўскай» праграмы варта прыглядацца ўжо цяпер. Сёлета, напрыклад, дырэкцыя здолела атрымаць тое, пра што марыла летась. Напрыклад, румынскую стужку «Мары пра Каліфорнію» і ізраільскую працу «Візіт аркестра», якая ўжо да гэтага часу назбірала 32 узнагароды (дарэчы, рэкламай гэтай стужкі з'яўляецца ўжо тое, што яе закупілі нават арабскія краіны). Упершыню да нас прыедуць фільмы з Нарвегіі і Мексікі. Але зусім не як сціплыя навічкі: мексіканская кінастужка «Маўклівы свет» рэжысёра Карласа Рэйгадаса атрымала 23 узнагароды, у тым ліку на Канскім фестывалі. Яшчэ адзін фільм быў сёлета ў праграме Канскага кінафестывалю — «Іншы ўва мне» рэжысёра Эмілі Атэф з Германіі. На Маскоўскім міжнародным кінафестывалі прадстаўлялася балгарская карціна «Дзіфт». А ў Мінск прыедзе і лепшы польскі фільм года «Час паміраць» Дароты Кедзежаўскай. Будзе магчымасць ацаніць развіццё творчасці тых рэжысёраў, якія раней атрымалі лаўры «Лістапада» — Станіслава Гавархіна і Аляксандра Прошкіна з Расіі, і Эрнэста Абдыжапарава з Кыргызстана, Вігена Чалдраняна з Арменіі. Але адзін пераможца прыедзе не столькі сябе паказаць, колькі на іншых паглядзець, прычым вельмі прафесійна і ўважліва. Валерый Тадароўскі сёлета ўзначаліць прафесійнае журы кінематаграфістаў.

— Мяне пытаюцца, у чым адрозненне ў праграмах гэтага года і мінулага? — падсумоўвае Расціслаў Янкоўскі. — Не адрозніваюцца яны толькі тым, што пошасці і жорсткасці ў фільмах не будзе. У нас тут свае крытэрыі адбору, скіраваныя найперш на адкрыцці духоўнасці ў кіно. Дзеля гэтага заснаваны спецыяльны прыз Прэзідэнтам Беларусі. Цікава, але вядомая расійская актрыса Эліна Быстрыцкая, якой гэты прыз быў прысуджаны летась, пыталася неяк у мяне: «А дзе ж мой прыз?» Яна хварэла і не магла яго атрымаць асабіста. Прыз ёй пайшоў праз расійскае пасольства. Сёлета мы яшчэ не вызначыліся з кандыдатурай на гэты прыз і будзем падыходзіць да яе выбару вельмі адказна, каб чалавек цаніў той давер, які аказалі яму ў Беларусі і імкнуўся да нас прыехаць.

Адкрыццё фестывалю, які пачнецца ў сярэдзіне лістапада, плануюць правесці ў Палацы Рэспублікі. Тут ёсць нюанс, які для спецыялістаў вельмі істотны. Прэстыжнасць залы — гэта адно. Але кінаабсталяванне Палаца Рэспублікі зношанае, канстатаваў дырэктар Дэпартамента па кінематаграфіі Міністэрства культуры Максім Буданаў. Выйсце будзе знойдзена — фільм адкрыцця будзе паказаны на відэапраекцыйнай сістэме. Але каб фестываль трымаў марку, давядзецца звярнуцца да кіраўніка дзяржавы з просьбай аб замене кінаабсталявання палаца.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

# «РЭАЛЬНЫ» ФУТБОЛ

**Дэбют БАТЭ ў групавым этапе Лігі чэмпіёнаў адбыўся — каманда пачала сваё выступленне з процістаяння самаму тытулаванаму клубу гэтага турніру — мадрыдскаму «Рэалу», прычым на яго хатнім стадыёне. Таму пройгрыш з лікам 0:2 барысаўскай каманды назваць няўдалым пачаткам ніяк нельга.**

Галоўны трэнер БАТЭ Віктар Ганчарэнка лічыць, што дэбют яго каманды ў Лізе чэмпіёнаў атрымаўся. «Канчатковы вынік не такі дрэнны. Натуральна, мы гулялі горш, бо засталіся ўдзесяцярых. У нас маладая каманда і мы спадзяёмся пастаянна прагрэсаваць. Клуб упершыню ўдзельнічае ў такім турніры, як Ліга чэмпіёнаў, таму дэбют атрымаўся адносна нядрэнным», — заявіў Віктар Ганчарэнка ў інтэрв'ю прэс-службе УЕФА.

Нягледзячы на перамогу, галоўнага трэнера мадрыдскага «Рэала» Бернда Шустэра не задаволіла гульня падапечных. Ён лічыць, што яшчэ ў пачатку сустрэчы яго каманда павінна была забіваць тры мячы ў вароты БАТЭ і перамагаць з буйным лікам. «Улічваючы тое, як мы пачалі сустрэчу, чакаў, што мы заб'ём больш галоў, таму я расчараваны. Зрэшты, радуе, што мы ўзялі тры ачкі. Пасля першага гола было бачна, што БАТЭ не зможа адказаць, і нам трэба было забіваць другі і трэці мяч. У выніку ж нам давялося ўсё пачынаць спачатку. Мне не спадабалася, што мы расслабіліся. Чаму гэта адбылося? Спытайце ў гульцоў. Я іх аб гэтым не прасіў. Мы ўпусцілі выдатны шанц запісаць на свой рахунак буйную перамогу і парадаваць балельшчыкаў яшчэ больш.

«Зеніт» з мінімальным лікам саступіў «Ювентусу»,таму выйдзе на матч супраць нас звялікім жаданнем. Калі нам удасца дасягнуць добрага выніку ў Санкт-Пецярбургу, гэта стане вялізным крокам наперад на шляху ў плэй-оф», — цытуе Шустара афіцыйны сайт УЕФА.

Вось як пракаментавалі старт Віктара Ганчарэнкі і яго падапечных у самым прэстыжным еўрапейскім футбольным турніры яго калегі.

**Аляксандр Хацкевіч, галоўны трэнер ФК «Віцебск»:**

— Чаканы вынік. На маю думку, трэба смялей гуляць нават з такімі камандамі, як «Рэал» — турнір пачаўся, гэта не гульня на выбыванне. Ёсць аб'ектыўныя прычыны — не было двух асноўных нападаючых (Блізнюка і Радзівонава. — **Аўт.**) і наперадзе нічога асабліва не атрымлівалася. Стандартныя палажэнні ў БАТЭ заўсёды былі на дастаткова добрым узроўні, але на гэты раз атрымаць з іх нічога не ўдалося. У першым тайме быў адзін удар па варотах, і той для Касільяса небяспекі не хаваў. Не ўдалося выкарыстаць БАТЭ і яе козыр — хуткі пераход ад абароны ў атаку. Зразумела, што пачынаць Лігу чэмпіёнаў адразу з «Рэала» і прытым на яго стадыёне, няпроста. Як футбаліст у мінулым і ўдзельнік матчаў Лігі чэмпіёнаў магу сказаць, што скаванасць прысутнічае. Але трэба верыць у сябе... Тым не менш, першы крок зроблены. І спадзяюся, хлопцы ўсвядомілі, што з гэтымі камандамі можна і трэба гуляць на роўных. Каманда, безумоўна, старалася — маглі і к 10-й хвіліне 0:2 прайграваць. Добра, што дзесьці і выканаўчае майстэрства гульцоў «Рэала» падвяло. Сапернік згуляў на класе. Калі БАТЭ пачынала набліжацца да іх варотаў, яны абавязкова адказвалі. На адзін момант каля сваіх варот яны стваралі 2-3 небяспечныя эпізоды каля варот саперніка. Клас мадрыдцаў значна вышэйшы і вопыт у іх недасягальны.

**Юрый Курненін, галоўны трэнер маладзёжнай зборнай Беларусі па футболе:**

— Беларуская каманда згуляла дастойна. І футбалісты псіхалагічна даволі ўпэўнена для першага матча выглядалі, але сапернік на гэты раз быў класам вышэйшы. «Рэал» аб'ектыўна больш моцны. Ёсць неаспрэчны фактар у сучасным футболе — фінансавы. Калі зараз БАТЭ выйшла ў групавую стадыю, то не пашкодзілі б у складзе больш моцныя гульцы, якія б маглі скласці канкурэнцыю сапернікам з разраду сусветных грандаў. У футболе, як і ў спорце ў цэлым, як і ў эканоміцы, усё залежыць ад фінансавых уліванняў, і не трэба пра гэта забываць.

**Юрый Вяргейчык, галоўны трэнер ФК «Шахцёр»:**

— Парадавала тое, што стараліся не толькі абараняцца, але і атакаваць. Згулялі на сваім узроўні, а магчыма нават і вышэй. Два асноўныя атакуючыя футбалісты не гулялі, зразумела, што наперадзе не ўсё ладзілася. Але ў цэлым выглядалі дастойна. Ці можна чакаць прагрэсу ў наступных матчах? Гэта трэба не ў мяне спытаць, а ў Ганчарэнкі. Я мяркую, што можна. Не хацелася б толькі, каб яны ў гэту нядзелю прагрэсавалі ў гульні з «Шахцёрам».

**Дзмітрый Ліхтаровіч, капітан БАТЭ:**

— На такіх стадыёнах мы не гулялі яшчэ ніколі, таму хваляванне было, і досыць вялікае. Але страху перад грозным «Рэалам» не было. Спадабалася тое, што сапернік і сам іграе, і нам даваў іграць. Хаця дзеянні ў атацы ў нас не атрымліваліся. Мяркую, калі б Гена і Віталік былі на полі, пагроз варотам гаспадароў было б больш. Калі ігрок «Рэалу» атрымліваў мяч, пад яго адразу адкрывалася некалькі партнёраў. Варыятыўнасць развіцця атак у іх была вельмі вялікай — раней нам не даводзілася сутыкацца з камандай, у якой так наладжана каманднае ўзаемадзеянне. Калі шчыра, маглі прапусціць і больш. Дзесьці пашанцавала, дзесьці сапернік згуляў няўдала, дзесьці выручаў Верамко. Дзейнічаць крыху вальяжна мадрыдцы, на маю думку, пачалі пасля выдалення Хагуша. Прыбаўляць ім не было неабходнасці — маючы фору ў два мячы і гуляючы ў большасці, яны проста давілі матч да перамогі. На «Санцьягу Бернабеў» будзе ўсім складана — і «Зеніту», і «Ювентусу». У «Рэале» сабраны не проста раскручаныя «зоркі», гэта ігракі найвышэйшага ўзроўню, якія гуляюць вельмі хутка, у адзін-два дотыкі. Калі б мы праводзілі хаця б дзесятак матчаў падобнага ўзроўню за сезон, то нам было б куды прасцей.

**Алена АЎЧЫННІКАВА.**

## Спорт-тайм

### ТРЭЦЯЯ ПЕРАМОГА Ў КВАЛІФІКАЦЫІ ЕЎРАФОРУМУ

Чарговую перамогу ў адборачным турніры чэмпіянату Еўропы-2009 у дывізіёне «В» атрымала



Фота БЕЛТА

мужчынская зборная Беларусі па баскетболе. На гэты раз у Магілёве яна адолела каманду Албаніі — 92:46. Нагадаем, раней падапечныя Аляксандра Папкова на выездзе ўзялі верх над камандай Швейцарыі (81:77) і дома перагулялі румынскую дружыну (70:59). Наступны паядынак беларусы правядуць у суботу, 20 верасня. У гасцявым супрацьстаянні яны праэкзаменуюць кіпрыётаў. Права працягнуць барацьбу за выхад у наймацнейшы дывізіён атрымаюць пераможцы квінтэтаў, а таксама адна зборная, якая будзе мець найлепшыя паказчыкі сярод тых, хто заняў другія месцы. Восенню наступнага года гэта чацвёрка разыграе два пропускі ў вышэйшы свет.

### БЕЗ СЕНСАЦЫЙ

Матчамі ў групах E, F, G і H 17 верасня завяршыўся першы тур групавога этапа футбольнай Лігі чэмпіёнаў. Вось вынікі матчаў: група E — «Манчэстэр Юнайтэд» (Англія) — «Вільярэал» (Іспанія) — 0:0, «Селтык» (Шанлатдыя) — «Ольбарг» (Данія) — 0:0; група F — «Сцяўа» (Румынія) — «Баварыя» (Германія) — 0:1, «Ліён» (Францыя) — «Фіярэнціна» (Італія) — 2:2; група G — «Порту» (Партугалія) — «Фенербахчэ» (Турцыя) — 3:1, «Дынама» (Украіна) — «Арсенал» (Англія) — 1:1; група H — «Ювентус» (Італія) — «Зеніт» (Расія) — 1:0, «Рэал» (Іспанія) — БАТЭ (Беларусь) — 2:0. Другі тур пройдзе 30 верасня — 1 кастрычніка.

### «ДЫНАМА» ВЫЙГРАЛА ХАТНІ ПАЯДЫНАК

Першую перамогу ў родных сценах атрымалі хакеісты мінскага «Дынама» ў межах КХЛ. Пазаўчора ўы сталічным Палацы спорту падапечныя Джыма Х'юза па булітах аказаліся мацнейшымі за падмаскоўнае МУС — 3:2. Галоўны трэнер мінскага «Дынама» выказаў незадаволенасць рэакцыяй балельшчыкаў і прэсы на няўдачы каманды ў КХЛ. «У нас не самая тэхнічная каманда, але яна працуе з вялікім стараннем, — падкрэсліў Дж. Х'юз на прэс-канферэнцыі пасля матча з падмаскоўным МУД. — Я задаволены беларускім хакеем. Але я расчараваны, што балельшчыкі незадаволеныя. Трэба падтрымліваць каманду і ў складаных сітуацыях. Нельга рабіць паспешлівыя высновы. Нашы гульцы ўпершыню прадстаўленыя ў КХЛ. Маскоўскі «Спартак» існуе 60 гадоў, а мы — 60 дзён».

Цяпер беларускі клуб чакае выязное турнэ. 22 верасня «бела-блакітныя» паспрачаюцца з маскоўскім «Спартаком», 24-га — памераюцца сіламі з «Віцязем» з Чэхава, яшчэ праз два дні пазмагаюцца з маскоўскім ЦСКА, а завершаць вояж 28 верасня сустрэчай з чарапавецкай «Поўначсталлю».

### НА МАТЧ «ЮВЕНТУС — БАТЭ» БІЛЕТАЎ НЯМА

Білеты на матчу групавой стадыі Лігі чэмпіёнаў паміж барысаўскім БАТЭ і турынскім «Ювентусам» паступілі ў продаж 16 верасня. А на наступны дзень яны скончыліся. І ў касах мінскага стадыёна «Дынама», на якім 30 верасня і пройдзе матч, і ў касах гарадской арэны Барысава. Квіткі па 5 тысяч рублёў у сектары за варотамі размялі ўмомант. Многія бралі не па адным дзясятку — для шматлікіх сяброў ці для перапродажу. Білеты ў цэнтральныя сектары ў касы не паступалі — іх рэалізуюць па безнаяўным разліку па калектыўных заяўках. Выпадкі, калі продаж прапускоў па такіх схемах заканчваўся пустэчамі на трыбунах пры дзікіх чэргах каля кас, на жаль, не адзінкавыя.

### АДБЫЛАСЯ ЖАРАБ'ЁЎКА МАТЧУ КУБКА ДЭВІСА

У Мінскай гарадской ратушы адбылася жараб'ёўка матча Кубка Дэвіса паміж камандамі Беларусі і Грузіі, які пройдзе 19—21 верасня ў мінскім Палацы тэнісу. Матч пачнецца з сустрэчы першай ракеткі беларускай каманды Уладзіміра Ігнаціка і другога нумара грузінскай зборнай Лада Чыхладзэ. Затым на корт выйдуць другі нумар беларускай каманды Андрэй Каратчэня і першы нумар грузінскай зборнай Іраклій Лабадзэ. У другі дзень, 20 верасня, адбудзецца парны паядынак, дзе дуэт Максіма Мірнага і Уладзіміра Ігнаціка пазмагаецца з грузінскай парай Іраклій Лабадзэ/Лада Чыхладзэ. У нядзелю сустрэнуцца першыя нумары абедзвюх камандаў, а потым другія. Пачатак усіх дзён спаборніцтваў запланаваны на 10 гадзін.

Тэлесеткі

# «ПРОСТА ПРАГРАМА» Ў НОВЫМ ФАРМАЦЕ

**Менавіта такой убачаць яе гледачы на канале «ЛАД» у пачатку кастрычніка. Вядучую Аксану Вечар у праекце заменіць Аляксандр Дамарацкі — вядомы тэлежурналіст, двухразовы ўладальнік прэміі Нацыянальнага конкурсу «Тэлевяршыня».**

Адпаведна, з новым вядучым зменіцца і жанр праграмы — цяпер гэта будуць партрэтныя інтэрв'ю з рознымі людзьмі творчых прафесій — акцёрамі, мастакамі, архітэктарамі, паэтамі, пісьменнікамі, музыкантамі і г.д. «Гэта мой любімы тэлевізійны жанр, а любімая тэма — людзі мастацтва», — тлумачыць Аляксандр Дамарацкі. Прычым героям давядзецца не проста адказваць на пытанні вядучага, але і самому характарызаваць сябе, а таксама каментаваць мініінтэрв'ю з яго калегамі, сябрамі і знаёмымі, і выказваць сваё стаўленне да актуальных падзей у свеце, да культуры, да чалавечых заганаў і адметнасцяў...

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ
о проведении внеочередного Общего собрания акционеров Открытого акционерного общества «Белвнешэкономбанк» в заочной форме

Открытое акционерное общество «Белвнешэкономбанк», расположенное по адресу: 220050, г. Минск, ул. Мясникова, 32, сообщает о проведении 2 октября 2008 г. внеочередного Общего собрания акционеров в заочной форме.

**ПОВЕСТКА ДНЯ
ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ**

1. О внесении изменений в устав ОАО «Белвнешэкономбанк».
2. О предоставлении безвозмездной (спонсорской) помощи Представительству Национального Олимпийского комитета Республики Беларусь в Брестской области.
3. О предоставлении безвозмездной (спонсорской) помощи КУП «Оршакомхоз».
4. О предоставлении ценного подарка для чествования победителей и передовиков уборки урожая в рамках проводимого фестиваля-ярмарки тружеников села «Дожинки-2008».
5. О предоставлении безвозмездной (спонсорской) помощи Республиканскому общественному объединению «Семейный центр социально-психологической помощи «Доверие».
6. О предоставлении безвозмездной (спонсорской) помощи Минской городской организации Белорусского общества Красного Креста.
7. О предоставлении безвозмездной (спонсорской) помощи Приходу храма Вознесения Господня в городе Несвиже.
8. О предоставлении безвозмездной (спонсорской) помощи Государственному учреждению «Национальный музей истории и культуры Беларуси».
9. О предоставлении безвозмездной (спонсорской) помощи Борисовскому районному исполнительному комитету.
10. О предоставлении безвозмездной (спонсорской) помощи Общественному объединению «Республиканская Ассоциация членов семей военнослужащих, погибших в Афганистане, «Память и долг».
11. О предоставлении безвозмездной (спонсорской) помощи Прудникову Максиму Васильевичу.
12. О предоставлении безвозмездной (спонсорской) помощи Игумновой Елене Викторовне.
13. О предоставлении безвозмездной (спонсорской) помощи ЧУП «Агрофирма «Орда».

Список лиц, имеющих право на участие в Общем собрании акционеров, составлен на основании данных реестра владельцев акций ОАО «Белвнешэкономбанк», сформированного на 18 сентября 2008 г.

Лица, имеющие право на участие в Общем собрании акционеров, могут ознакомиться с решением о проведении Общего собрания акционеров ОАО «Белвнешэкономбанк» в заочной форме, другой необходимой информацией и заполнить бюллетени для заочного голосования, начиная со дня опубликования данного извещения, ежедневно, кроме выходных и праздничных дней, с 9.00 до 13.00, по адресу: г. Минск, ул. Скрыганова, 6, ком. 707, а также в филиалах ОАО «Белвнешэкономбанк».

Заполненные бюллетени для заочного голосования должны быть представлены в ОАО «Белвнешэкономбанк» не позднее 29 сентября 2008 г. по адресу: Республика Беларусь, 220073, г. Минск, ул. Скрыганова, 6, ком. 707, почтой, нарочным либо по факсу (8 017) 209 25 48 с обязательной доставкой (досылкой) оригинала бюллетеня.

**Дополнительная информация по телефонам: (8 017) 209 24 21, 209 25 40.**

Актуальна

# БЕЛАРУСКАЯ АЭС МОЖА СТАЦЬ НАРОДНАЙ БУДОЎЛЯЙ

**Сёння каля 30 працэнтаў сукупнай «атамнай» энергіі, што выпрацоўваецца ў свеце, прыпадае на Злучаныя Штаты Амерыкі. Другое месца займае Францыя — 17-18 працэнтаў сусветных аб'ёмаў (унутры краіны гэты паказчык значна большы — на долю айчыннага «мірнага атама» прыходзіцца звыш 80 працэнтаў усёй энергіі, што спажываюць французы). Тройку лідараў замыкае Японія. Агульная доля «перадавікоў» у галіне атамнай энергетыкі перавышае 55 працэнтаў сусветнага аб'ёму энергіі, якая вырабляецца на АЭС.**

Атамная энергетыка была і застаецца, з аднаго боку, крыніцай рызыкі экалагічнай катастрофы, з другога — самым экалагічна чыстым і танным спосабам атрымання энергіі.

Аналіз сітуацыі паказаў, што прыродна-сыравінныя паліўныя рэсурсы, якія мае Беларусь, — абмежаваныя і нават пры максімальным выкарыстанні яны не могуць задаволіць агульныя ўнутраныя патрэбы больш чым на 30 працэнтаў. Што тычыцца аднаўляемых і нетрадыцыйных крыніц энергіі — сонца, ветру, біямасы, гідра- і геатэрмальнай энергіі — яны могуць быць эфектыўнымі толькі ў лакальных маштабах, як дадатак да асноўных энергетычных крыніц. Акрамя таго, прыходзіцца ўлічваць дынаміку глабальных працэсаў у галіне энергетыкі, перш за ўсё — няўхільны рост цэнаў на нафту, газ і вугаль, а таксама непазбежнае вычарпанне планетных запасаў вуглевадародных энерганосьбітаў.

Тым не менш, для многіх нашых грамадзян перспектыва будаўніцтва на тэрыторыі Беларусі сваёй атамнай станцыі ўсё яшчэ выклікае страх і апасенні. Так, паводле рэспубліканскага апытання, праведзенага Інстытутам сацыялогіі НАН Беларусі, у 2005 годзе 41 працэнт рэспандэнтаў прызнаваў АЭС перспектыўнай крыніцай энергіі, а для 46 працэнтаў атамная энергетыка ў першую чаргу асацыявалася з наступствамі аварыі на Чарнобыльскай атамнай станцыі.

Для таго, каб высветліць, ці адбыліся за апошнія тры гады змяненні ў грамадскай свядомасці ў дачыненні да АЭС, памянёны інстытут па заказе Міністэрства энергетыкі ў студзені 2007 — лютым 2008 года правёў новае апытанне, удзел у якім узялі 2011 рэспандэнтаў з усіх абласцей краіны.

Яго вынікі паказалі, што сёлета захаваліся даволі высокія ацэнкі, дадзеныя насельніцтвам рабоце айчыннай энергетычнай галіны. Анкеты выявілі агульную высокую задаволенасць якасцю паслуг энергетыкаў, адсутнасць сур'ёзных прэтэнзій. 45,1 працэнта грамадзян сцвярджаюць, што энергетычная сітуацыя ў краіне палепшылася, 32,3 працэнта — не змянілася, і толькі 12,9 працэнта рэспандэнтаў лічаць, што яна стала горшай, чым у 2007 годзе. Прычым пазіцыя апошняй групы песімістаў напрамую звязана з іх ацэнкай перспектыў імпарту энергарэсурсаў у Беларусь. На пытанне, у якой меры, на вашу думку, Беларусь у будучым будзе мець цяжкасці з імпартам энергарэсурсаў, 32,6 працэнта рэспандэнтаў адказалі «пастаянна» (у 2005-м гэта меркаванне выказвалі толькі 21,7 працэнта).

Паводле слоў **вядучага навуковага супрацоўніка Інстытута сацыялогіі НАН Беларусі Міхаіла ХУРСА,** рацыянальнае ўсведамленне большасцю апытаных аб'ектыўнай складанасці нарошчвання тэмпаў імпарту энерганосьбітаў прывяло да істотных змяненняў у ацэнцы насельніцтвам перспектыў выкарыстання розных айчынных крыніц атрымання энергіі, у тым ліку і атамнага паліва. За тры гады індэкс яго перспектыўнасці, па ацэнцы беларусаў, узрос на 17,6 працэнтнага пункта (з 41 да 58,6 працэнта). Гэта сведчыць аб сур'ёзных пераменах у грамадскай свядомасці і значным пераадоленні комплексаў і сіндромаў, якія склаліся пасля аварыі на Чарнобыльскай АЭС. Як вынік — значнае змяненне грамадскай думкі ў цэлым па праблематыцы развіцця ядзернай энергетыкі ў нашай краіне.

Калі ў 2005 годзе на пытанне, ці павінна Беларусь развіваць уласную ядзерную энергетыку, станоўчы адказ далі 28 працэнтаў беларусаў, то ў 2008-м амаль 55 працэнтаў. Адмоўныя адказы адпаведна паменшыліся: з 47,7 да 23 працэнтаў. Сёння 41 працэнт грамадзян лічыць, што Беларусь не можа забяспечыць сваю энергетычную бяспеку без развіцця атамнай энергетыкі.

Важнейшым вынікам праведзенага апытання стала высвятленне дакладнай тэндэнцыі зніжэння ў краіне колькасці непрымірымых праціўнікаў будаўніцтва АЭС. Удзельная вага рэспандэнтаў, якія сцвярджалі, што не падтрымаюць будаўніцтва АЭС ні пры якіх умовах, знізілася з 22,9 працэнта ў 2005 годзе да 16,9 працэнта ў 2008-м. Больш за тое, людзі сталі гаварыць пра свае чаканні: якую выгаду яны мяркуюць атрымаць асабіста для сябе ад будаўніцтва АЭС (дзяржаўныя гарантыі, ільготы для тых, хто пражывае побач з АЭС і г.д.)

Частка беларускіх грамадзян нават гатовыя ўкласці свае сродкі ў будаўніцтва АЭС. Паводле слоў Міхаіла Мікалаевіча, на розных умовах (доўгатэрміновы дэпазіт, набыццё акцый АЭС і аблігацый дзяржаўнай унутранай пазыкі) сёння згаджаюцца паўдзельнічаць «рублём» ва ўзвядзенні атамнай станцыі 49 працэнтаў беларусаў.

Тым не менш, каля 25 працэнтаў апытаных пакуль не змаглі вызначыць свайго стаўлення да будаўніцтва АЭС у Беларусі.

Толькі 10,6 працэнта апытаных прызналі, што ім хапае інфармацыі, якую прадастаўляюць айчынныя сродкі масавай інфармацыі па асвятленні этапаў падрыхтоўкі да будаўніцтва АЭС у нашай краіне. 55 працэнтаў лічаць, што інфармацыі мала, яшчэ 17 — перакананыя, што інфармацыя па дадзенай тэматыцы ў СМІ практычна адсутнічае. У сувязі з гэтым дырэкцыя будаўніцтва атамнай станцыі ў самы бліжэйшы час плануе заснаваць пры сваёй структуры спецыялізаваны сектар па інфармацыйнай рабоце з насельніцтвам і адпаведны інтэрнэт-сайт. Пра гэта паведаміў журналістам начальнік вытворча-тэхнічнага аддзела дырэкцыі Віталь Малішэўскі.

**Інга МІНДАЛЁВА.**

### ВЁЗ 14 ТОН ЛОМУ

На аўтадарозе Полацк — Расоны міліцыянеры затрымалі МАЗ, на якім 21-гадовы беспрацоўны перавазіў больш як 14,2 тоны лому чорнага металу. Суправаджальныя дакументы на груз коштам 6 мільёнаў беларускіх рублёў, адсутнічалі, таму метал канфіскавалі.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# ПАВУК

Свет і сусвет чалавека

**Павук — сімвалічная істота ў культуры ўсходніх славян, звычайна з негатыўным сэнсавым значэннем: хітры, жорсткі і шкодны. Уся яго сутнасць заключана ў тым, каб плесці павуціннe і атрутным укусам паралізаваць сваю ахвяру.**

● У паданні распавядаецца аб тым, што Бог стварыў павука, калі стварыў зямлю, неба і чалавека. Але павук пачаў плесці сваю сетку, быццам бы другое неба, і стаў прычынай чалавечых грахоў. На Палессі існавала паданне аб тым, як Бог ператварыў у павука ткача, які пахваляўся «зацягнуць» сваім прадзівам увесь свет. Лічылася, што павука, як і змяю — Боскіх ворагаў — трэба забіваць, і тады чалавеку будуць дараваны ўсе яго грахі.

● У хрысціянстве павук стаў сімвалам д'ябла, які маніць чалавека ў грэшныя сеткі і п'е яго кроў.

● У той жа час у іншых паданнях павук выглядаў станоўчым персанажам: у адным з іх ён суцішыў муху, якая перашкаджала спаць маламу Хрысту, у другім — выратаваў Багародзіцу, заплёўшы павуціннем уваход у пячору, дзе яна хавалася ад ворагаў. І лічылася, што забіць павука — значыць, згубіць сваё шчасце.

● Павука звалі гаспадаром хаты, усяляк ахоўвалі, лічылі, што ён прыносіць поспех, багацце і дабрабыт.

● У беларускіх і ўкраінскіх паданнях павук узнімаецца на неба і нясе Богу хлебныя крошкі, пераконваючы яго, што людзі не шануюць хлеб і не павінны атрымліваць добры ўраджай. Таму лічылася вялікім грахом пакідаць пасля абеду крошкі на стале ці на падлозе.

● У народных прыкметах павук, які апускаецца са столі, быццам бы з неба, прадказваў хуткіх гасцей; павук, які апускаецца перад вачыма, з капелюша ці валасоў, прадказваў чалавеку шчасце, поспех; на парозе хаты — прадказваў пахаванне; чорны павук прадказваў няўдачу, белы — шчасце.

● Калі ўлетку павукі раскідаюць сеткі — будзе добрае надвор'е, прычым працяглы час; калі павуціння няма — будзе моцны вецер, навальніца.

**Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.**

ПАПЕРНЯНСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ МИНСКОГО РАЙОНА (ПРОДАВЕЦ) СОВМЕСТНО С КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ»

## ПРОВОДЯТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

**по продаже земельных участков в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов в д. Семково:**

| № лота | Площадь земельного участка, кадастровый номер | Наличие инженерных сетей | Начальная цена (бел. руб.) | Задаток (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 0,1439 га, 623685510601001079 | электроснабжение | 19 943 100 | 1 000 000 |
| 2 | 0,1571 га, 623685510601001078 | электроснабжение, в непосредственной близости газопровод | 21 772 490 | 1 100 000 |
| 3 | 0,1536 га, 623685510601001077 | электроснабжение | 21 287 424 | 1 100 000 |

Задаток перечисляется на р/с 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», г. Минск, МФО 153001357, УНП 690324015, КУП «Минский областной центр учета недвижимости». Победитель аукциона обязан в течение 10 рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за земельный участок, возместить расходы, связанные с подготовкой документации, необходимой для проведения аукциона: Лот № 1 — 728 145 рублей, Лот № 2 — 1 199 260 рублей, Лот № 3 — 695 690 рублей. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с документацией и земельными участками. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. **Аукцион состоится 28.10.2008 г. в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 321. Заявления на участие и необходимые **документы принимаются по 27.10.2008 г. до 17.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

**Контактный телефон (8017) 224 61 34.
Наш сайт в интернете: www.rlt.by.**

*КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015.*

Свислочский посисполком Пуховичского района (продавец) совместно с КУП «Минский областной центр учета недвижимости»

## ПРОВОДЯТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже земельного участка в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома в микрорайоне «Засвятое-3», г.п. Свислочь. Общая площадь участка 0,1037 га, кадастровый номер 624455900001000131. Начальная цена — 1 229 882 рублей. В непосредственной близости имеются сети электроснабжения, газоснабжения. Задаток — 100 000 рублей перечисляется на р/с 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», г. Минск, МФО 153001357, УНП 690324015, КУП «Минский областной центр учета недвижимости». Победитель аукциона обязан в течение 10 рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за земельный участок. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с документацией и земельным участком. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. **Аукцион состоится 28.10.2008 г. в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 321. Заявления на участие и необходимые **документы принимаются по 27.10.2008 г. до 17.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

**Контактный телефон (8017) 224 61 34.
Наш сайт в интернете: www.rlt.by.**

*КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015.*

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 74 13 92, Баранавічах: 7 26 02, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03; прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292 04 52.

http://www.zviazda.by

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 32.407 Індэкс 63850. Зак. № 5149. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12



5.

**Цудоўныя словы (у загалоўку), якія сказаў аднойчы кіраўнік Стаўбцоўскага доследнага лягаса Казімір Кажушка. Гэта сапраўды так: значэнне такое вялікае, што нават не заўважаем. А між тым, хоць і гучыць даволі банальна, лес — гэта наша сапраўднае багацце, адзін з нашых найгалоўнейшых рэсурсаў, месца цудоўнага адпачынку і крыніца натхнення для многіх і многіх людзей...**

Ахова лесу і прымнажэнне яго багаццяў — галоўная справа работнікаў Стаўбцоўскага доследнага лясгаса. І робяць яны гэта, ужо адразу варта зазначыць, з усёй самаадданасцю і стараннасцю. Дарэчы, як яны самі ўдакладняюць, менавіта так ставяцца да сваёй адказнай і высакароднай лясной справы ўсе лесаводы рэспублікі без выключэння. Лясная прафесія — гэта нават не проста прафесія, а прызванне, і ідуць у яе людзі, па-сапраўднаму ўлюбёныя ў лес.

Аднак да лясных спраў лесаводаў Стаўбцоўшчыны мы вернемся крыху ніжэй, а цяпер — пра тую значную падзею, якая адбылася ў лясгасе летам гэтага года і якая, без ніякага перабольшання, мае вялікае значэнне не толькі для самога лясгаса, але і для ўсёй рэспублікі.

А летам, некалькі месяцаў таму, у Стаўбцоўскім лясгасе пачала дзейнічаць вытворчасць па вырабе пелетаў з драўнянага пілавіння. На тэрыторыі дрэваапрацоўчага цэха лясгаса — цэлыя горы гэтага пілавіння, якое было назапашана яшчэ раней. Яно некалі, па сутнасці, беззваротна страчвалася (страчваецца іншымі малымі дрэваапрацоўчымі цэхамі і вялікімі камбінатамі і цяпер), як абсалютна ні на што не вартыя адходы лесапілавання. Хіба толькі часам бралі яго для сваіх патрэб жывёлагадоўчыя комплексы. А цяпер гэта пілавінне прыносіць лясгасу і рэспубліцы ў цэлым валюту. Вось толькі некаторыя лічбы і факты, якія назваў начальнік дрэваапрацоўчага цэха Стаўбцоўскага лясгаса Васіль Дзейчык. З пачатку дзейнасці цэха тут выраблена каля 400 тон пелетаў. Пры гэтым усе яны ідуць толькі на экспарт — у прыватнасці, у Польшчу, скандынаўскія краіны. Летам пелеты каштавалі больш за 80 еўра за тону, цяпер цана іх падрасла да 95 еўра, зімой чакаецца 120 еўра і вышэй за тону. Зразумела, вытворчасць пелетаў у Стаўбцоўскім лясгасе цяпер пакуль што, па сутнасці, у стадыі станаўлення, а з цягам часу іх плануецца вырабляць не менш за 300 тон за месяц. Няцяжка прыкінуць, колькі еўра ў лясгасе могуць зарабіць на драўнінным пілавінні, якое, нагадаем, у іншых месцах і цяпер, па сутнасці, выкідваецца (у лепшых выпадках спальваецца ва ўласных кацельнях цэхаў і камбінатаў). З цягам часу стаўбцоўскія вытворцы пелетаў плануюць забіраць пілавінне ў Клецкім, Капыльскім і Уздзенскім лясгасах. Наколькі выгаднай будзе яго перавозка? «Галоўнае, каб транспарт быў адпаведны, аб'ёмны, ды пляччо перавозкі не перавышала 50 кіламетраў», — зазначае Васіль Дзейчык.

Працэс вырабу пелетаў з драўніннага пілавіння адносна нескладаны. Яно спачатку паступае ў вялізны сушыльны барабан (для вырабу цяпла служаць адходы драўніны), потым — пад прэс. А ў выніку атрымліваюцца невялікія гранулы, якія адразу ж запакоўваюцца ў вялізныя «біг-бэгі» і трымаюць потым шлях за мяжу. Яны пры гэтым, як і належыць, праходзяць лабараторныя вы-



1.

прабаванні, сертыфікацыю. Пра цеплавую здольнасць пелетаў даволі красамоўна сведчыць наступны факт: у скандынаўскіх краінах яны выкарыстоўваюцца ў якасці паліва на электрастанцыях замест больш дарагога газу.

Паліўныя пелеты, такім чынам, становяцца добрай крыніцай валютных паступленняў у казну лясгаса. Пры гэтым варта асобна сказаць: Стаўбцоўскі лясгас і да пачатку іх вытворчасці з'яўляўся адным з вядучых сярод лясгасаў рэспублікі экспарцёраў. Што тут экспар-



2.



3.



4.

туюць? Так званую балансавую драўніну, або танкамер, прадукцыю лесапілавання, драўняныя вінаградныя калы (для абуладкавання вінаграднікаў). На ўсё гэта пераважна ідзе драўніна з высечак догляду лесу, якая, зразумела, мае меншую каштоўнасць, чым так званая дзелавая драўніна. За мінулы год у Стаўбцоўскім лясгасе зарабілі на экспарце больш за два з паловай мільёны долараў (рост экспарту адносна папярэдняга года ў грашовым выражэнні склаў 166 працэнтаў), сёлета плануюць атрымаць не меней — нягледзячы на тое, што некалькі зменшыўся попыт на гэту прадукцыю, а разам з тым і цана.

Дарэчы, стаўбцоўскія лесаводы маюць цяпер бясспрэчнае права называць сваю дрэваапрацоўчую вытворчасць выключна безадходнай.

* * *

Стаўбцоўскі лясгас, як бачна ўжо, мае ў сваёй назве слова «доследны». Які ў адпаведнасці з гэтай назвай ён носіць статус?

— Мы ў сябе апрацоўваем розныя тэхналогіі догляду лесу, тэхналогіі яго высечак і г.д., — тлумачаць тут. — Вынікі гэтых эксперыментаў потым дэталёва вывучаюцца і бяруцца (калі гэтыя вынікі паспяховыя) на ўзбраенне іншымі лесаводамі, лясгасамі рэспублікі. Цяпер, напрыклад, у нашым лясгасе праходзіць апрабаванне скандынаўская тэхналогія палосна-паступовай высечкі лесу...

Як патлумачылі тут, пры такой тэхналогіі ўхіл робіцца на натуральнае аднаўленне лесу, лес не трэба спецыяльна садзіць, як пасля суцэльных высечак; пры гэтым лепш захоўваецца непасрэдна лясное асяроддзе, менш траўмуецца лясная глеба.

Самае вялікае ў Стаўбцоўскім лясгасе — Акінчыцкае лясніцтва, і кіруе ім Міхаіл Цялушка — самы малады ляснічы.

— Вось і нагрузілі, як маладога, — прытворна паскардзіўся ён, паказваючы свае лясныя ўладанні. Каля 14 тысяч гектараў складаюць гэтыя ўладанні, на якіх пераважна расце хвоя. — Гэта вельмі святлолюбівае дрэва. Разам з тым, як і ўсялякая любая расліна, на самым пачатку патрабуе догляду. Трэба, напрыклад, глядзець, каб не захварэла каранёвай губкай, — працягваў Міхаіл Цялушка. — А вось тут у 1997 годзе ў нас ураган прайшоў, паламаў лес. Давялося садзіць новы. Ужо добрыя дрэўцы...

Машына ляснічага ззаду была загружана 50-кілаграмовай жалязякай, якую ён падабраў у лесе.

— Нехта па дарозе выкінуў, — скардзіўся ён. — А нам потым падбірай. Ну чаму многія так некуль[redacted]цца даводзіцца [redacted]мі. Нашы леснікі, [redacted]сам проста пераўтвараюцца ў [redacted]нікаў...

Гэта праблема, якую закрануў малады ляснічы, набыла немалую вастрыню. Цяперашні добра матарызаваны лясны аматар даязджае да самых глухіх лясных месцаў і амаль паўсюдна пакідае за сабой смецце. Тую ж пустую бутэльку цяпер нечакана можна знайсці нават у самым глухім кутку леса. Леснікі ўжо даўно б'юць трывогу: дзе ваша экалагічная культура, людзі, ваша культура ўвогуле? І сапраўды, дзе?

Тэрыторыя Акінчыцкага лясніцтва тым больш клапатлівая, што размешчана побач з горадам, тут знаходзіцца мноства дачных кааператываў. Гэта значыць, яго лясы найбольш часта наведваюць, тым больш, што гэтыя мясціны багатыя на грыбы. Адпаведна, мае малады ляснічы Акінчыцкага лясніцтва на летне-асенні перыяд, усе работнікі іншых лясніцтваў і лясгасаў яшчэ адзін вялікі клопат — гэта пажарная бяспека лясных угоддзяў. Дарэчы, у Стаўбцоўскім лясгасе на гэты пажаранебяспечны перыяд спецыяльна арганізавана дзяжурства яго адказных работнікаў — у пазаўрочны час і ў выхадныя дні.

Догляд маладога лесу і яго ахова, пасадка новага лесу і высечка спелага — гэта звычайны клопат работнікаў лясной гаспадаркі. Гэты звычайны клопат мелі сёлета і работнікі Стаўбцоўскага лясгаса. Чым яшчэ займаліся тут сёлета? Намеснік дырэктара па ідэалагічнай рабоце Аляксандр Шарапа расказаў: немалую дапамогу аказалі сёлета работнікі Стаўбцоўскага лясгаса, працягваюць аказваць цяпер Бярэзінскаму лясгасу, лясы якога напаткаў у гэтым годзе ўраган. Каля сямі тысяч кубаметраў бураломных дрэў прыбралі сёлета стаўбцоўскія работнікі лесу ў сваіх калег з Беразіно. Удзел у ліквідацыі вынікаў урагану ўзялі каля 200 чалавек, пры гэтым была задзейнічана і тэхніка.

Яшчэ сёлета вялікую работу правялі працаўнікі Стаўбцоўскага лясгаса па добраўпарадкаванні прыдарожных лясных палос аўтамагістралі «Брэст — Расійская Федэрацыя». «На адлегласці да 100 метраў ад трасы падабралі ўвесь сухастой, увесь валежнік, усё выкасілі, вывезлі... Навялі ідэальны парадак. Калі ўжо наводзіць і падтрымліваць добры парадак на нашай зямлі, то каму ў гэтых адносінах паказваць прыклад, як не нам, лясным работнікам?» — зазначае Аляксандр Шарапа.

* * *

Лясы Стаўбцоўскага лясгаса месцяцца ў маляўнічых мясцінах. Тут працякае ўслаўлены ў беларускіх песнях велічны Нёман; на тэрыторыі лясгаса знаходзіцца цудоўнае возера Кромань; надзейна хавае пад сваім зялёным покрывам чырванакніжныя расліны і жывёл Налібоцкі ландшафтны заказнік... Але найперш, нагадаем, гэта зямля і лясы народнага паэта Беларусі Якуба Коласа. І гэтак жа старанна, як выконваюць свае



6.



7.







# СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 6.50 | 19.15 | 12.25 |
| Віцебск — | 6.39 | 19.05 | 12.26 |
| Магілёў — | 6.40 | 19.05 | 12.25 |
| Гомель — | 6.37 | 19.01 | 12.24 |
| Гродна — | 7.06 | 19.30 | 12.24 |
| Брэст — | 7.07 | 19.30 | 12.23 |

## Месяц

*Поўня.*

*Месяц у сузор'і Цяльца.*

## Імяніны

***Пр.*** *Архіпа, Давыда, Дзмітрыя, Івана, Канстанціна, Кірылы, Міхаіла, Усевалада.*

***К.*** *Канстанцыі, Эміліі, Леапольда, Тодара, Януара.*

# НАДВОР'Е на заўтра





## ...у суседзяў

| | |
|---|---|
| ВАРШАВА | +8..+10°С |
| ВІЛЬНЮС | +8..+10°С |
| КІЕЎ | +11..+13°С |
| МАСКВА | +9..+11°С |
| РЫГА | +10..+12°С |
| С.-ПЕЦЯРБУРГ | +9..+11°С |

# 19 верасня

Дзве даты

**1478 год** — італьянец Леанарда да Вінчы завяршыў работу над славутай «Монай Лізай» — партрэтам жанчыны з самай загадкавай усмешкай на свеце.



**1925 год** — у Мінску нарадзіўся Юрый Іванавіч Драздоў, савецкі разведчык. З 1957 года працаваў у нелегальнай рэзідэнтуры КДБ СССР у Заходнім Берліне, Пекіне, Нью-Ёрку. У 1979—1991 гадах — начальнік Упраўлення «с» (нелегальная разведка) 1-га Галоўнага разведвальнага ўпраўлення КДБ СССР (ГРУ). Стваральнік групы спецыяльнага прызначэння «Вымпел» для вядзення сакрэтных аперацый за межамі краіны.

Цытата дня:

***«Сутнасць кахання заключаецца ў тым, каб ніколі не быць шчаслівым».***

**Клод Адрыян Гельвецый (1715—1771), французскі філосаф-асветнік.**

